ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ

МС



ВАША ПЕЧАНЬ У БЯСПЕЦЫ?

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

31 ліпеня 2024 г.
СЕРАДА
№ 147 (30281)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

КАРАТКА

• У аўторак Прэзідэнт правёў тэлефонную размову са старшынёй праўлення ПАТ «НК «Раснафта» Ігарам Сечыным. Таксама беларускі лідар пагаварыў па тэлефоне са старшынёй Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Расійскай Федэрацыі Генадзем Зюганавым.

• 5 жніўня 2024 года Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар Сергяенка правядзе асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Палаце прадстаўнікоў. Прыём праводзіцца па папярэднім запісе па тэл. (017) 222-69-25 з 30 ліпеня па 2 жніўня 2024 года з 08.00 да 18.00.

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей КАВАЛЬЧУК, міністр спорту і турызму:

«Тое, што нашы спартсмены вымушаны выступаць на Алімпіядзе ў нейтральным статусе і што з 35 беларускіх спартсменаў, якія выйгралі ліцэнзіі, да гульняў дапушчаны толькі 17 чалавек, не робіць гонару чыноўнікам ад спорту. Але ніякім чынам не прымяншае заслуг нашых спартсменаў, якія паехалі на Алімпійскія гульні. Няважна, у якім статусе і пад якім сцягам, але яны — прадстаўнікі Рэспублікі Беларусь. Мы ўсе за іх перажываем і хвалюемся. Выхад у фінал Алімпійскіх гульняў у плаванні і тое, што нашы спартсмены прадстаўляюць Беларусь на гэтых спаборніцтвах, ужо сведчыць аб тым, што сёння мы ў правільным кірунку рухаемся.

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Галоўнае — айчынная навука павінна рухаць эканоміку краіны»

Прыйшоў час спытаць навукоўцаў за канкрэтны вынік

«Краіна знаходзіцца на такім этапе развіцця, калі без навукі немагчыма зрабіць ніякага руху наперад. Таму навука і яшчэ раз навука», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы нараду з рабочай групай па аналізе дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У склад гэтай групы ўвайшлі прадстаўнікі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў. У Палацы Незалежнасці члены рабочай групы разам з членамі ўрада, прадстаўнікамі Адміністрацыі Прэзідэнта і навукоўцамі сабраліся, каб актуалізаваць праблемы, абмяняцца меркаваннямі па іх вырашэнні і выказаць свае погляды на сітуацыю ў цэлым.

Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, чым была выклікана неабходнасць стварэння рабочай групы. «Сказаць, што мы не займаемся навуковымі даследаваннямі, як фундаментальнага характару, так і прыкладнога, не займаемся навукай у адукацыйных установах, было б няправільна. Займаемся, — сказаў ён. — Навуцы мы аддаём усе прыярытэты, без яе развіццё немагчымае. Але апошнім часам я бачу, што Акадэмія навук дапускала сур'ёзныя пралікі». Па словах Прэзідэнта, у такой сферы як навука, дзе прыходзіцца ісці непратаптанымі шляхамі, асвойваць сур'ёзныя праблемы, браць вяршыні, натуральна, памылкі магчымыя. Але, прызнаўся кіраўнік краіны, яго насцярожыла тое, што Акадэмія навук дапускала памылкі там, дзе іх быць не павінна, дзе ёсць добрая база ведаў і кампетэнцый. У прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў жывёлагадоўлю і раслінаводства. «Навукова-практычныя цэнтры створаны ў Акадэміі навук. Яны працуюць не лепш за іншыя адпаведныя цэнтры, якія працуюць па-за Акадэміяй навук, а павінны быць лепшымі», — заўважыў ён.

Па словах кіраўніка дзяржавы, звароты навукоўцаў, спецыялістаў і членаў урада пераконваюць у тым, што нам трэба сур'ёзна паглядзець на развіццё акадэмічнай навукі і прыняць адпаведныя рашэнні па ўсіх кірунках, у тым ліку і кадравыя. «Я не хачу, каб прысутныя тут члены Акадэміі навук і навукоўцы падумалі, што мы тут рыхтуем нейкую акцыю супраць Акадэміі навук. Не. Нам трэба вельмі сур'ёзна падысці да вывучэння праблем Акадэміі навук і прыняць адпаведныя рашэнні. Бо без навукі далей нікуды», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

ГЭТА СТРАТЭГІЧНА ПРАВІЛЬНЫ ПАДЫХОД

Прэзідэнт падкрэсліў, што мы жывём у эпоху беспрэцэдэнтных магчымасцяў развіцця нашай краіны. «Магчымасці каласальныя ўпусціць нельга. Ёсць устойлівая база і пэўныя вынікі як у традыцыйных галінах, так і ў новых кірунках эканомікі. Але без рэальнага прарыву ў навуцы падняцца на наступную прыступку будзе не проста складана — немагчыма. Навука павінна апярэджваць час, а не плесціся ў хвасце», — заявіў ён. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што з першых дзён прэзідэнцтва ён ставіў працу навукоўцаў у аснову ўсіх пераўтварэнняў жыцця.

«Развіццё айчыннай навукі — найважнейшы прыярытэт дзяржаўнай палітыкі. У свой час мы не далі знішчыць навуковыя школы і шматгадовыя напрацоўкі. Зрабілі ўсё магчымае для іх захавання. Мы зрабілі ўсё, як хацелі нашы вучоныя, акадэмікі, члены-карэспандэнты, дактары і кандыдаты навук, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мяркую, надышоў час спытаць навукоўцаў за пэўны вынік. З якімі фундаментальнымі, стратэгічнымі распрацоўкамі мы ўвойдзем у новыя сярэдне- і доўгатэрміновую праграмы развіцця рэспублікі? Ці гатовы забяспечыць свой тэхналагічны суверэнітэт у цяперашніх рэаліях?»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што размова не толькі і не столькі аб санкцыях. Па яго словах, мы да гэтага ўжо прывыклі, тым больш, яны пройдуць. «Размова пра шалёнае развіццё свету. Асабліва Азіі. Але і Захад не спіць у шапку. На апошнім саміце НАТА заяўлены чацвёрты прыярытэт (аж да стварэння цэнтральных органаў на ўзроўні Альянсу) — «тэхналагічны рывок». А гэта — квантавыя тэхналогіі, штучны інтэлект, біялогія і лічбавая трансфармацыя. Мы не павінны і проста не маем права адстаць», — сказаў ён.

СТАР. 2

Жніво-2024

«ВАЖНА ПРОСТА ЛЮБІЦЬ СВАЮ СПРАВУ»

У чым сакрэт поспеху першых трохтысячнікаў Міншчыны

У Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці першыя камбайнеры-трохтысячнікі прынялі віншаванні. Механізатары Васіль ЗУР і Сяргей МАКСІМЕЦ з сельскагаспадарчага прадпрыемства «Крутагор'е-Петкавічы» ўжо ставілі нацыянальны рэкорд. У 2022 годзе яны першыя ў гісторыі краіны намалацілі шэсць тысяч тон збожжа на беларускім камбайне.

СТАР. 3

Год якасці

Павысіць узровень гасціннасці

Як зрабіць унутраны турызм больш прывабным?

Інфраструктура гасціннасці ў Беларусі развіваецца і ўдасканальваецца з кожным годам. Наша краіна можа як прымаць індывідуальных турыстаў, так і размяшчаць удзельнікаў значных мерапрыемстваў і падзей — міжнародных спартыўных спаборніцтваў, вялікіх канцэртаў, фестываляў, культурных форумаў. Што робіцца для павышэння якасці турпаслуг? Што павінен ведаць турыст, каб атрымаць турыстычную паслугу належнай якасці? І што рабіць, калі падчас падарожжа ўсё пайшло не так, як было заяўлена? Як атрымаць у такім выпадку кампенсацыю? Як прысвойваюцца зоркі гасцініцам і што павінна быць у пяцізоркавым атэлі? На што звярнуць увагу, расказалі спецыялісты.

СТАР. 5



Фота з адкрытых крыніц.

«Галоўнае — айчынная навука павінна рухаць эканоміку краіны»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што гэта нават не пытанні — гэта задачы, у вызначэнні якіх, паводле нядаўніх сацыялагічных даследаванняў, улада і грамадства адзіныя. Ён нагадаў, што ў прыярытэтах развіцця краіны беларусы на першае месца паставілі навукаёмістыя галіны прамысловасці, якія забяспечваюць тэхналагічны прарыў і выхад на знешнія рынкі, а таксама высокатэхналагічныя галіны аграпрамысловага комплексу. І ў сувязі з гэтым ні ў якім разе нельга забываць пра жалезнае патрабаванне: забяспечыць самую высокую якасць.

«Гэта стратэгічна правільны падыход, — заўважыў беларускі лідар. — Дарогі, жыллё, адукацыя, культура, спартыўныя аб'екты — усё гэта будзе развівацца, калі забяспечым у краіне навукаёмістую канкурэнтаздольную вытворчасць. Адсюль — экспарт, годныя зарплаты, падаткі і бюджэт. Поспех на новых рынках залежыць ад таго, з якім прадуктам мы туды зойдзем і наколькі ён будзе запатрабаваны». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што і ўніверсітэцкі, і галіновы, і акадэмічны сектары навукі павінны працаваць на гэтую мэту ў цесным узаемадзеянні. Па яго словах, трэба прааналізаваць, наколькі адладжана гэтае ўзаемадзеянне і ці няма распылення з улікам кампактнасці Беларусі.

«Галоўнае — айчынная навука павінна рухаць эканоміку краіны. Гэта значыць, павінен быць канкрэтны вынік, адчувальны для дзяржавы і людзей. Асабліва зараз», — канстатаваў Прэзідэнт. Пры гэтым, ён падкрэсліў, ні ў якім разе не адмаўляе развіццё фундаментальнай навукі. Яна дазваляе зазірнуць за гарызонт, гэта важна. І яна, як запэўніў кіраўнік дзяржавы, будзе ў нас развівацца. «Але сённяшні дзень робяць вынікі прыкладных даследаванняў. Менавіта яны ўзнімаюць краіну на новы ўзровень», — заўважыў ён.

КАЛІ НЯМА ПЕРАЕМНАСЦІ — І ВУЧОНАГА НЯМА

Беларускі лідар звярнуў увагу, што зараз ідзе працэс выбараў членаў Акадэміі навук. «Значнасць іх навуковых распрацовак для дзяржавы — краеугольны камень крытэрыяў адбору», — заўважыў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што таксама важна наяўнасць уласнай школы, якая прываблівае ў навуку моладзь. «Калі няма прадаўжальнікаў ідэй, няма пераемнасці — і вучонага няма», — адзначыў ён.

Прэзідэнт падтрымаў прапанову саміх вучоных аб тым, што неабходна ўстанавіць дакладныя крытэрыі адбору кандыдатаў у акадэмікі і члены-карэспандэнты. «Ніякіх кумаўства і кругавой парукі, чым часта грашыць гэтая сфера, — папярэдзіў ён. — А потым правесці выбары ў адпаведнасці з абноўленымі Статутам НАН Беларусі і Палажэннем аб выбарах. Узмацняючы пул акадэмікаў і членкораў, варта сыходзіць з таго, ці дастатковы іх рэальны ўклад у айчынную эканоміку. Ці стаяць нашы вучоныя ў авангардзе вырашэння стратэгічных эканамічных і сацыяльных задач?»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адзін важны аспект. Ён узгадаў тэзіс аб тым, што навука не мае айчыны. «Але навукоўцы нараджаюцца, вучацца і дасягаюць пэўных вышынь, будучы грамадзянамі сваёй краіны. Большасць вялікіх навукоўцаў — сапраўдныя патрыёты. Скажу больш: грамадзянін з высокім званнем вучонага павінен быць самым актыўным правадніком дзяржаўнай пазіцыі,» — сказаў беларускі лідар.

У цэлым, па словах Прэзідэнта, пытанняў да навуковага асяроддзя шмат. Ёсць пэўныя поспехі, але і незадаволенасць вынікамі таксама сур'ёзная. Таму кіраўніком дзяржавы і было прынята рашэнне аб стварэнні пастаянна дзейнай камісіі на чале са старшынёй Камітэта дзяржкантролю. Да гэтай работы было даручана прыцягнуць самых адказных спецыялістаў, палітыкаў для таго, каб адказаць на злабадзённыя пытанні развіцця Акадэміі навук. Рабочая група працуе нядоўга, таму на дадзеным этапе неабходна вызначыць асноўныя падыходы, акрэсліць мэты гэтай работы, пазначыць кола пытанняў, якія патрабуюць разгледжання. Група будзе працаваць да 1 лістапада і па выніках сваёй дзейнасці прадставіць даклад, па выніках якога будуць прымацца адпаведныя рашэнні, накіраваныя на ўдасканаленне дзейнасці беларускай навукі на карысць краіны.

У тэму

Васіль ГЕРАСІМАЎ:

«Галоўнае пытанне — як дапамагчы Акадэміі навук»

Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіль Герасімаў падчас нарады далажыў, што за час сваёй працы рабочая група вылучыла шэраг праблем. Распаўсюджаная праблема звязаная з тым, што многія навукова-даследчыя работы не пераходзяць на стадыю ўкаранення ў вытворчасць. Гэта значыць, што пэўныя этапы сістэмы навуковай дзейнасці не спрацоўваюць. Таксама сярод праблем ён назваў адсутнасць адзінай стратэгіі ў фарміраванні навуковых дзяржаўных праграм, неканкрэтныя мэты і задачы гэтых праграм. Васіль Герасімаў таксама адзначыў, што супрацоўніцтва Акадэміі навук з рэальным сектарам эканомікі патрабуе пастаяннага кантролю — вынікі асобных распрацовак выкарыстоўваюцца толькі на працягу тэрмінаў укаранення іх у вытворчасць на адным прадпрыемстве, а не ў маштабах галіны. Асобныя навуковыя арганізацыі, па словах кіраўніка рабочай групы, працуюць на тым, што створана папярэднікамі, не імкнуцца да інавацыйнай дзейнасці, працуючы выключна ў сваіх інтарэсах.

У размове з журналістамі Васіль Герасімаў растлумачыў, што зараз гаворка не ідзе аб глабальных праблемах і перабудове ў дзейнасці Акадэміі навук. «Асноўнае пытанне, якое зараз стаіць, — як дапамагчы Акадэміі навук. Гэта першае. Другое — мы не разглядаем Акадэмію навук у адрыве ад галіновай і ўніверсітэцкай навукі. І таксама ёсць пытанні, якія трэба вырашаць. І яшчэ адно важнае пытанне — гэта практыкаарыентаванасць, гэта значыць тыя напрацоўкі, якія ёсць у Акадэміі навук, павінны актыўна ўкараняцца ў вытворчасць. Пакуль гэта не заўсёды спрацоўвае. Таму асноўная мэта дзейнасці рабочай групы — максімальна павысіць ККД Акадэміі навук», — растлумачыў ён.

Раман ГАЛОЎЧАНКА:

«Трэба забяспечыць ператок распрацовак у вытворчасць»

Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка адзначыў, што галоўная мэта рабочай групы — не выявіць недахопы і кагосьці за іх пакараць, а знайсці рэзервы, якія дапамогуць зрабіць дзейнасць Акадэміі навук яшчэ лепшай, закласці асновы, якія дадуць вынікі ў бліжэйшай і сярэднетэрміновай перспектыве. Кіраўнік урада заўважыў, што ва ўсіх свае погляды на гэтыя пытанні, і важна знайсці кампраміс, які дасць магчымасць узмацніць пазіцыі беларускай навукі. «Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу не спыняцца, быць максімальна канкрэтнымі, максімальна прадметнымі, ісці ад жыцця», — сказаў Раман Галоўчанка. Ён звярнуў увагу, што гаворка не ідзе пра глабальную рэформу Акадэміі навук, хутчэй пра данастройку сістэмы: «Настройка зроблена, але трэба рэгуляваць, таму што час ідзе, мяняюцца прыярытэты, нейкія задачы становяцца больш вострымі, больш актуальнымі, таму што сусветныя працэсы бурныя. І для таго, каб не апынуцца на абочыне, трэба своечасова мяняць прыярытэты і розныя працэсы», — адзначыў прэм'-ер-міністр.

Раман Галоўчанка расказаў, што, на яго погляд, зараз трэба зрабіць акцэнт на ўдасканаленні працэсу трансферу тэхналогій, ператочку распрацовак у серыйную вытворчасць. Паводле яго слоў, праблемы ў гэтай галіне звязаны ў тым ліку з недастатковай колькасцю інжынірынгавых кампаній, якія выконваюць функцыю ператочку распрацовак у серыйную вытворчасць. У Беларусі ёсць нядрэнныя таму прыклады — некалькі кампаній, у тым ліку і ў прыватным сектары, якія з'яўляюцца рэзідэнтамі навукова-тэхнічных паркаў і забяспечваюць зручны пераход ад распрацоўкі да ўкаранення ў вытворчасць. «Трэба знайсці фінансавыя інструменты, і мы над гэтым працуем, каб аказаць падтрымку прадпрыемствам у задзейнічанні вынікаў навукова-тэхнічнай дзейнасці, якая здзяйсняецца не ў рамках іх падраздзяленняў, а, напрыклад, у структуры Акадэміі навук. Гэта таксама вельмі важна. Таму што працэс укаранення распрацовак дастаткова дарагі: для гэтага неабходна правесці цыкл падрыхтоўчых работ, набыць новае абсталяванне, наладзіць вытворчыя працэсы. Пад гэта патрэбны фінансавыя інструменты. Для нас гэтая тэма цяпер актуальная», — адзначыў Раман Галоўчанка.

Вадзім БОГУШ:

«Навуковая дзейнасць — абавязковая частка адукацыйнага працэсу»

Вадзім Богуш, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, член рабочай групы, размаўляючы з журналістамі, зрабіў акцэнт на ўніверсітэцкай навуцы. Па яго словах, сёння ўніверсітэцкая навука не з'яўляецца фундаментальнай, яна мае практычныя распрацоўкі. «Вядома, гэта не масавая вытворчасць, гэта адзінкавыя і дастаткова навукаёмістыя рэчы. Але навука ў ВНУ паказала, што рэчы высокага ўзроўню могуць вырабляцца ў нашай краіне», — сказаў ён. Вадзім Богуш расказаў, што Прэзідэнт паставіў яшчэ адну важную задачу перад універсітэцкай навукай — прыцягненне моладзі да навуковай дзейнасці. «Гэта абавязковая частка адукацыйнага працэсу. Але вельмі важна, каб маладыя людзі, пачынаючы з першых курсаў, узаемадзейнічалі з навукоўцамі, каб яны для сябе маглі зразумець, ісці далей у навуку ці не, — сказаў рэктар. — Мы зацікаўлены ў прыцягненні вопыту Акадэміі навук, мы зацікаўлены ў выкарыстанні вопыту практыкаў з розных галін. Таму што рашэнне практычных задач — гэта важны элемент у адукацыйнай дзейнасці. І калі студэнты маюць магчымасць паўдзельнічаць у распрацоўцы — гэта для іх дадатковы стымул развівацца».

Валерыя СЦЯЦКО.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАМІЛАВАЎ РЫКА КРЫЕГЕРА

Прыгавораны да выключнай меры пакарання грамадзянін Германіі Рыка Крыегер звярнуўся да Прэзідэнта Беларусі з прашэннем аб памілаванні. Ён прызнаны вінаватым у акце тэрарызму, агентурнай дзейнасці, наёмніцтве, стварэнні экстрэмісцкага фарміравання або ўдзеле ў ім, незаконных захоўванні і нашэнні выбуховых рэчываў і выбуховых прылад, учыненых арганізаванай групай, наўмысным пашкоджанні шляхоў зносін, што магло прывесці да смерці чалавека, крушэння і іншых цяжкіх наступстваў. Перш чым прыняць рашэнне аб памілаванні (пра гэта ўвечары паведаміла прэс-служба Прэзідэнта), Аляксандр Лукашэнка запрасіў на размову людзей, паглыбленых у гэту справу.

«Самае непрыемнае пытанне ў лёсе і жыцці Прэзідэнта, якое атрымала вельмі сур'ёзнае гучанне. Рыка Крыегер — грамадзянін Германіі. Аказваецца, толькі ў 1993 годзе нарадзіўся. Судом прыгавораны ў Беларусі да выключнай меры пакарання. Паводле нашай Канстытуцыі і законаў, апошняе слова заўсёды за Прэзідэнтам. Звяртаецца, не звяртаецца (за памілаваннем. — **Рэд.**)... Я ўжо неяк гаварыў, што самае цяжкае ў лёсе Прэзідэнта — гэта падобныя справы, звязаныя з выключнай мерай пакарання. Але рашэнне трэба прымаць. Я хачу проста з вамі ў гэтым плане, можа, і параіцца. Але пачуць ваша меркаванне. Вы — людзі, якія непасрэдна маюць дачыненне да разгляду гэтай справы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

На сустрэчу, акрамя старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Івана Тэртэля, намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольгі Чупрыс, якая курыруе юрыдычныя пытанні, была запрошана журналіст Людміла Гладкая, якая інфармацыйна суправаджала гэту крымінальную справу. Таксама ў кабінет Прэзідэнта былі запрошаны следчы па гэтай справе і адвакат, які абараняў у судзе Рыка Крыегера. «Наколькі я ведаю, суд абвінаваціў яго не толькі ў гэтым. Таму я вас папрашу, вы мяне праінфармуйце, перш чым я буду прымаць рашэнне па гэтым пытанні», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У тэму

Прэзідэнту трэба прымаць складанае рашэнне

Следчы па справе — намеснік начальніка ўпраўлення КДБ Беларусі Аляксандр ГРЫБ у размове з журналістамі адзначыў, што віна Рыка Крыегера ва ўчыненні злачынстваў, якія яму інкрымінуюцца, поўнасцю даказана. Прэзідэнту былі даложаны ўсе акалічнасці гэтай крымінальнай справы.

«Сумненняў у яго вінаватасці не ўзнікала. З улікам таго, што Рыка Крыегер падаў хадайніцтва аб памілаванні на імя Прэзідэнта, гэтае рашэнне цяпер за Прэзідэнтам у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам», — дадаў Аляксандр Грыб. Ён падкрэсліў, што кіраўнік дзяржавы ўважліва выслухаў усіх прысутных на сустрэчы.

«Я ацэньваю гэту размову як шчырую. Мяркую, што Прэзідэнт пачуў меркаванне ўсіх бакоў, якія прысутнічалі ў працэсе размовы. Мы разлічваем на акт гуманізму, які прыме кіраўнік дзяржавы», — сказаў журналістам **адвакат Уладзімір ГОРБАЧ**, які абараняў Рыка Крыегера ў судзе. «Усё ў руках Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Астатняе — інсінуацыі. Мы чытаем у прэсе шмат навін, але ў мяне асабіста ніякіх пацвярджаючых звестак як аб памілаванні, так і адхіленні гэтага хадайніцтва няма. Аляксандр Рыгоравіч сказаў, што будзе думаць і прыме рашэнне» , — дадаў адвакат.

Журналіст Людміла ГЛАДКАЯ інфармацыйна асвятляла судовы працэс над грамадзянінам Германіі. Яна расказала калегам, як усяго праз некалькі хвілін пасля абвяшчэння смяротнага прысуду нямецкія дыпламаты, выходзячы з залы суда, абдымаліся і ўсміхаліся. «Я думаю: вось толькі што грамадзяніну вашай краіны вынеслі (нават калі не браць тое, што ён здзейсніў) смяротны прысуд, а ў вас усмешкі... І яшчэ ў мяне склалася ўражанне, што гэтым людзям (паколькі цяпер мы не чуем ніякіх дзеянняў ці заяў з боку ўладаў Германіі), можа быць, проста рэальна пляваць, — сказала журналіст. — Як бы там ні было, якія б злачынствы ні здзейсніў чалавек, але ён грамадзянін вашай краіны. І я нават у нейкі момант злавіла сябе на думцы: а можа быць, яны хочуць, каб смяротны прысуд прывялі ў выкананне?» Людміла Гладкая заўважыла, што цяпер атрымалася так, што гэтага чалавека няма каму абараніць, і ён звярнуўся з прашэннем аб памілаванні да Прэзідэнта Беларусі.

«Так, я, вядома, разумею, што гэта вельмі цяжкія злачынствы, ім абсалютна няма апраўдання. І пакуль я сядзела ў зале суда, я проста не разумела, як чалавек у здаровым розуме наогул здольны здзяйсняць падобнае. Гэта страшнае злачынства — тэракт. З іншага боку, убачыўшы ўсё гэта, гэту рэакцыю — яго кінулі — шчыра, мне нават неяк па-чалавечы, па-жаночаму стала яго шкада», — заявіла Людміла Гладкая.

«Вырашаць Прэзідэнту. Яму трэба прыняць вельмі складанае рашэнне. Але ўпэўнена, што ён, як заўсёды, зробіць мудра», — сказала журналіст.

Валерыя СЦЯЦКО.

«ВАЖНА ПРОСТА ЛЮБІЦЬ СВАЮ СПРАВУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёлета на палях Мінскай вобласці сфарміраваўся нядрэнны ўраджай. Рэгіён будзе забяспечаны неабходнай колькасцю збожжа, а насельніцтва — якаснымі прадуктамі. Добрая ўраджайнасць спрыяе з'яўленню перадавікоў на жніве. А тое, што першыя тры тысячы тон збожжа сабралі на айчыннай тэхніцы, сведчыць, што беларускія камбайны пераўзыходзяць імпартныя аналагі.

АД СВІТАННЯ ДА ЦЯМНА

Цяпер у аграрыяў няма часу на вялікія перапынкі. Ва ўмовах сюрпрызаў надвор'я механізатары цэняць кожную хвіліну. Таму на віншаванне першых трохтысячнікаў Васіля Зура і Сяргея Максімца было адведзена пяць хвілін. Паціснулі рукі і зноў за штурвал.

Працоўны стаж у экіпажа на дваіх чалавек амаль паўстагоддзя. Лідары хлебнай нівы разумеюць адзін аднаго з паўслова. Адсюль і вынікі. На іх камбайне ёсць фірмовае лога «МакЗур» — складзенае з прозвішчаў. У полі зорны экіпаж бачны здалёк.

На гомельскім камбайне аграрыі працуюць не першы сезон. «Без паломак не бывае, але па-хуткаму ўстараняем іх. Галоўнае, спакойным быць. Калі нервавацца, то і вынікаў вялікіх і не будзе», — лічыць Сяргей Максімец.

«Сёлета мы ўжо ўзялі трохтысячны рубеж, аднак на дасягнутым спыняцца не збіраемся. Многае залежыць ад надвор'я. Спадзяёмся, што яно і далей будзе спрыяць нам. Ды з тэхнікай праблем няма. Магутныя і надзейныя — беларускія камбайны без праблем дазваляюць браць новыя вышыні», — дадаў камбайнер.

Сяргей Максімец працуе на айчынным камбайне трэці сезон. І столькі ж радуе прадпрыемства ўдалымі вынікамі па ўборцы. «Тэхніку трэба берагчы, любіць і своечасова абслугоўваць. А так няма ніякага сакрэту — важна проста любіць сваю справу», — сказаў ён.

Уборачная кампанія — час надзвычайнай адказнасці. Нярэдка камбайнеры працуюць на палях ад світання да захаду сонца. «На жаль, з-за такой загружанасці не заўсёды паспяваю зрабіць усе хатнія справы... Але сям'я ставіцца да гэтага з разуменнем, а гэта — самае галоўнае», — адзначыў Сяргей Максімец.

ЧАТЫРЫ ЎМОВЫ ДЛЯ РЭКОРДУ

Кожная ўзятая тысяча — падстава для гонару. І кожны такі рубеж не застаецца незаўважаным. Камбайнераўтысячнікаў падтрымліваюць грашовымі прэміямі і прыемнымі падарункамі. Сяргею Максімцу ААТ «Гомсельмаш» сёлета падарыла новы тэлевізар. Падтрымлівае і роднае прадпрыемства.

«Зладжаная праца, надвор'е і ўраджайнасць, — пералічвае ўмовы для сваіх перамог памочнік камбайнера Васіль Зур. — Ураджай у параўнанні з мінулым годам вышэй».

Чацвёртая ўмова — тэхніка. Памочнік камбайнера расказаў пра зручнасці на борце сваёй машыны: «Тут ёсць халадзільнік, боксы для халодных і гарачых прадуктаў, лічбавы камп'ютарны манітор, на якім можна адсочваць неабходныя працэсы. Бачна страты пры ўборцы, няспраўныя элементы камбайна. Для змазкі машыны ёсць цэнтралізаваная сістэма. Усё аўтаматызавана, і гэта палягчае працу камбайнера і яго памочніка. Але асабісты кантроль, вядома, патрэбны».

Камбайнер павінен любіць сваю працу, пагаджаецца з напарнікам Васіль Зур. «Трэба акуратна і беражліва ставіцца да тэхнікі і ведаць яе. Без гэтага проста ніяк. Першапачаткова я працаваў зусім на іншай машыне, але з вопытам перасаджваўся на камбайны ўсё больш высокага класа. За больш чым чвэрць стагоддзя прапрацаваў на самай рознай тэхніцы, таму мне ёсць з чым параўнаць», — кажа ён.

Васіль Зур дадае: «Мне падабаецца працаваць на зямлі. Вядома, мы з напарнікам спадзяёмся, што на такім выніку не спынімся — будзем ісці далей і далей».

Старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сяргей ПРЫМАЧЭНКА, які наведаў Дзяржынскі раён з прыемнай місіяй — павіншаваць лідараў жніва, — пажадаў таго ж: «Жадаю, каб гэта быў не апошні ваш рубеж».

Сяргей Прымачэнка заўважыў, што ў гэтым годзе ў Беларусі была «афрыканская» спякота, больш за 66-69 дзён па многіх рэгіёнах стаяла засуха. «Адпаведна, мы выдатна разумелі, што сёлета павінны атрымаць ураджай і ўсё для гэтага зрабіць. Сёння ўжо перасягнулі мяжу ў 50 працэнтаў. (29 ліпеня. — Аўт.). Мы не павінны супакойвацца. Прырода можа падаваць нам пэўныя сюрпрызы. Таму кожная хвіліна і кожная гадзіна вельмі дарагі», — сказаў ён.

Сяргей Прымачэнка адзначыў, што задача ўладаў — цалкам забяспечыць камбайнераў усімі неабходнымі матэрыяламі. Калі камбайн зламаўся, аператыўна павінна прыехаць група, каб ліквідаваць непаладку. У гэты час камбайнеры могуць адпачыць або паабедаць. «Камбайн заўсёды застаецца на палях — перагоны максімальна выключаны. Мы разумеем, што нагрузка на іх істотная — больш за 300 гектараў сёлета. Дарэчы, па Мінскай вобласці па збожжавых ужо перасягнулі мільён тон», — паведаміў ён.

Да віншавання перадавікоў далучыліся намеснік старшыні Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта Вольга Ігнатава, старшыня прафсаюза АПК Раіса Смяян і кіраўнік гаспадаркі Юрый Клімаш. У той жа дзень рэкорд устанавілі не толькі Сяргей Максімец і Васіль Зур, але і вадзіцель сельскагаспадарчага прадпрыемства Вадзім Агароднікаў, які перавёз 2000 тон збожжа. Атрымаўшы каштоўныя ўзнагароды, работнікі адразу вярнуліся да жніва — разгар сезона расслабляцца не дае.

«СЯМ'Я НАТХНЯЕ»

Прыкладна ў той жа час у Клецкім раёне вызначыўся малады кіроўца-трохтысячнік **Андрэй АЛЯКСЕЙЧЫК з ААТ «Кухчыцы»**. Усяго на ўборачнай у вобласці працуюць каля 340 маладых вадзіцеляў, якія ажыццяўляюць транспарціроўку збожжавых і зернебабовых культур з палёў.

Стаж Андрэя Аляксейчыка ў гаспадарцы 12 гадоў. Ён пачаў сваю прафесійную дзейнасць з моманту атрымання пасведчання кіроўцы. На дадзены момант перавёз ужо больш 3536 тон збожжавых і зернебабовых культур.

З дзяцінства Андрэй захапляўся тэхнікай, ды і перад вачыма быў прыклад дзеда-трактарыста. Таму, калі прыйшоў час выбіраць прафесію, вырашыў стаць кіроўцам. «І, ведаеце, ні разу не пашкадаваў. Дарэчы, я не ўпершыню ўдзельнічаю ў конкурсе ад БРСМ «Моладзь — за ўраджай!». Некалькі гадоў таму ўжо станавіўся пераможцам. Гэта вельмі адказна і ганарова», — падзяліўся ён.

Традыцыйна праект «Моладзь — за ўраджай!» праходзіць ва ўсіх рэгіёнах краіны ў перыяд уборачнай кампаніі. Яго ўдзельнікамі з'яўляюцца маладзёжныя уборачныя экіпажы камбайнераў і маладыя вадзіцелі транспартных сродкаў, якія ажыццяўляюць перавозку збожжавых і зернебабовых культур. Адметная асаблівасць іх тэхнікі — стылізаваная налепка з лагатыпам праекта. Спаборніцтвы праходзяць у дзвюх намінацыях: «Маладзёжны экіпаж камбайнераў, які дасягнуў найбольшага намалоту» і «Малады вадзіцель, які перавёз найвышэйшую колькасць збожжавых і зернебабовых культур».

У сезон уборачнай Андрэй Аляксейчык з'яўляецца дома рэдка. Жартуе, што прыходзіць толькі пераначаваць, але сям'я ставіцца да гэтага з разуменнем. «Мяне чакаюць жонка і дзве дачкі. Яны ўжо прывыклі, што летам мяне амаль не бачаць. Калі знаходжуся ў полі, пастаянна пра іх думаю. Яны натхняюць мяне на рэкорды», — дадаў ён.

Першым павіншаваў працаўніка **старшыня Клецкага раённага выканаўчага камітэта Юрый КАРЛОВІЧ**.

«Планету рухаюць маладыя, — падкрэсліў кіраўнік раёна. — І ўдвая прыемна сёння, што лепшы малады вадзіцель нашай рэспублікі працуе ў нас. Для нас ён — найлепшы ва ўсім свеце».

Ключавыя фактары, якія вызначаюць поспех Андрэя — адданасць працы і неверагодная ўпартасць. Ён не толькі імкнецца да выканання сваіх абавязкаў, але і пастаянна ўдасканальвае свае навыкі, вывучаючы асаблівасці тэхнікі і метады аптымізацыі працэсу перавозкі грузаў.

Калега Андрэя **кіроўца Вячаслаў КАПЫЦІЧ** у гаспадарцы працуе ўсяго чатыры месяцы. Да гэтага працаваў кіроўцам на малой радзіме ў Івацэвіцкім раёне. А потым пераехаў у Клецкі ўслед за дзяўчынай, якая атрымала размеркаванне ў «Кухчыцы». У новым калектыве яго прынялі цёпла, прызнаецца Вячаслаў. На дадзены момант ён перавёз 2892,6 тысячы збожжавых і зернебабовых культур.

«За некалькі месяцаў адаптаваўся. З самага пачатку ўпарта імкнуўся стаць адным з лідараў. І ў мяне атрымалася! Тут усё проста: трэба любіць тое, што робіш, і цалкам аддавацца сваёй працы. А больш ніякіх сакрэтаў няма. Галоўнае, каб машына не падводзіла. Дарэчы, мой бацька таксама кіроўца. Яго прыклад заўсёды натхняў мяне. На дасягнутым спыняцца не збіраюся: хацелася б па выніках уборачнай стаць найлепшым у краіне», — прызнаўся Вячаслаў Капыціч.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота з архіва Сяргея Максімца і з тэлеграм-канала Мінская вобласць/ Пра галоўнае.
Дзяржынскі раён.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Міністры абароны ЗША, Японіі і Паўднёвай Карэі падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве

Кіраўнік Пентагона Лойд Осцін, а таксама міністры абароны Японіі і Рэспублікі Карэя Мінору Кіхара і Сін Вон Сік падпісалі ў Токіа мемарандум у рамках пагаднення аб трохбаковым супрацоўніцтве ў галіне бяспекі. Пра гэта паведамляецца ў заяве, распаўсюджанай амерыканскім ваенным ведамствам, паведаміла ТАСС. Мемарандум быў падпісаны на трохбаковай сустрэчы кіраўнікоў ваенных ведамстваў. На ёй таксама былі абмеркаваны агульныя праблемы ў сферы бяспекі, паведамілі ў Пентагоне. У прыватнасці, міністры выказалі занепакоенасць супрацоўніцтвам Пхеньяна з Масквой і падпісаннем Дагавора аб усеабдымным стратэгічным партнёрстве паміж РФ і КНДР.

У Філадэльфіі прайшоў першы з'езд «Рэвалюцыйных камуністаў Амерыкі»

Першы з'езд партыі «Рэвалюцыйныя камуністы Амерыкі» адбыўся ў Філадэльфіі (штат Пенсільванія). Пра гэта партыя паведаміла ў сацсетцы, перадае ТАСС. Як вынікае з размешчаных у акаўнце паведамленняў і відэазапісаў, пасля завяршэння мерапрыемства каля 500 прыхільнікаў партыі выйшлі на вуліцы горада. Удзельнікі дэманстрацыі пранеслі чырвоныя сцягі з сярпом і молатам, скандзіруючы розныя лозунгі, сярод якіх «Даеш класавую барацьбу ў 2024-м!». Партыя была створана ў пачатку 2024 года. Як адзначаецца ў праграме, яе мэта — «ліквідацыя капіталізму ў ЗША, барацьба з вайной, няроўнасцю, прыгнётам», а таксама пераход улады ў краіне ў рукі рабочага класа.

У Вялікабрытаніі ў выніку нападзення з нажом загінулі тры дзяўчынкі

Сама меней трое дзяўчынак загінулі пасля нападзення з нажом на дзіцячы танцавальны клуб, якое адбылося ў брытанскім горадзе Саўтпарт, што знаходзіцца непадалёк ад Ліверпуля на поўначы Вялікабрытаніі. Пра гэта паведаміла «Бі-бі-сі». 9-гадовая дзяўчынка пайшла з жыцця ўчора ў бальніцы. Дзве іншыя дзяўчынкі, шасці і сямі гадоў, памерлі ад нажавых раненняў 29 ліпеня. Пяць параненых дзяцей знаходзяцца ў крытычным стане. Акрамя таго, з цяжкімі раненнямі ў клінікі яшчэ двое дарослых. Па падазрэнні ў здзяйсненні нападзення ў Саўтпарце арыштаваны 17-гадовы малады чалавек, які жыве ў суседнім горадзе Бэнкс. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Кір Стармер назваў нападзенне «насамрэч жахлівым».

Дамоўленасці — у канкрэтныя праекты

У апошні час міжнародная дзейнасць Міністэрства адукацыі Беларусі перажывае адну з самых актыўных сваіх фаз

Узбекістан, Кітай, Манголія, сустрэча міністраў адукацыі краін БРІКС у Казані. І гэта без уліку замежных калег, якіх прымала кіраўніцтва ведамства ў Беларусі, а таксама даўняга, цеснага і эфектыўнага ўзаемадзеяння з Міністэрствам навукі і вышэйшай адукацыі Расіі.

Імпульс гэтым актыўнасцям надала спачатку сустрэча ў Пекіне лідараў Беларусі і Кітая ў канцы 2023 года, дзе яны абмяркоўвалі пытанні маладзёжнай палітыкі, студэнцкага абмену і інш. Тэма атрымала працяг і на сустрэчы кіраўніка дзяржавы з сакратаром партыйнага камітэта Пекінскага ўніверсітэта, старшынёй педагагічнага савета, намеснікам старшыні камісіі па міжнародных справах Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Хаа Пінам, падчас якой Прэзідэнт падкрэсліў неабходнасць пашырэння камунікатыўных сувязяў паміж народамі ўвогуле і моладдзю ў прыватнасці.

Кітай: толькі наперад, ні кроку назад

Адна з самых значных сустрэч гэтага года — вялікі візіт у Кітай дэлегацыі Міністэрства адукацыі, які пачаўся з наведвання калыскі кітайскай дыпламатыі: Пекінскага ўніверсітэта замежных моў. Аб рабоце беларускай дэлегацыі ў Кітаі і аб супрацоўніцтве з Паднябеснай у галіне адукацыі расказвае **міністр адукацыі Беларусі Андрэй ІВАНЕЦ:**

— Сёння супрацоўніцтва з Кітаем — адзін са стратэгічных вектараў нашага міжнароднага парадку дня. І гэта цалкам заканамерна, таму што яшчэ на заранку сваёй незалежнасці, больш за 30 гадоў таму, мы ўстанавілі дыпламатычныя адносіны з КНР. Ужо тады кіраўнік дзяржавы бачыў і перспектыву, і патэнцыял гэтых адносін. І, як заўсёды, меў рацыю, таму што сёння Кітайская Народная Рэспубліка з'яўляецца другой эканомікай свету, там засяроджаны высокія тэхналогіі і навукаёмістыя вытворчасці. Усяго гэтага немагчыма было б дасягнуць без той развітой адукацыйнай сістэмы і яе дзяржаўнай падтрымкі, якія там былі створаны і паспяхова дзейнічаюць цяпер.

Мы сустракаліся з маім калегам, міністрам адукацыі, і абмяркоўвалі шэраг прынцыповых момантаў развіцця нашага супрацоўніцтва. Першы і вельмі важны — рэалізацыя сумесных адукацыйных праграм, якія дазваляюць выдаваць дыплом падвойнага ўзору, паміж універсітэтамі Кітая і Беларусі. Яны таксама дазваляюць выкарыстоўваць найлепшыя адукацыйныя тэхналогіі і напрацоўкі КНР і Беларусі, аб'яднаць іх пад патрэбы нашай эканомікі і вытворчасцяў, у тым ліку і сумесных, якія ствараюцца сёння ў рамках рэалізацыі такіх буйных праектаў, як індустрыяльны парк «Вялікі камень», беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя і шэраг іншых.

Другое, што мы абмяркоўвалі, — развіццё навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж нашымі ВНУ. У лістападзе мінулага года была створана асацыяцыя беларуска-кітайскіх універсітэтаў, а сёлета, у рамках візіту ў КНР, адбылося ўжо другое пасяджэнне гэтага аб'яднання. Падчас яго запушчана шэсць кластараў па тых кірунках, якія стануць падмуркам для распрацоўкі ўласных праектаў: інфармацыйныя тэхналогіі, інжынерныя спецыяльнасці і шэраг іншых. Іх трэба ўкараніць у рэальны сектар эканомікі, каб яны сталі асновай стварэння прадпрыемстваў, працоўных месцаў, і мы змаглі наладзіць выпуск новай, запатрабаванай не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі, прадукцыі.

Ну і трэці кірунак — гэта ў самым шырокім сэнсе гуманітарнае супрацоўніцтва. У Кітаі дзейнічаюць 12 цэнтраў вывучэння Беларусі.

Працуюць яны на базе ўніверсітэтаў, і там вывучаецца не толькі беларуская мова, але і наша культура, гісторыя, звычаі. У сваю чаргу, у Беларусі функцыянуюць інстытуты і кабінеты Канфуцыя, дзе вядзецца вывучэнне кітайскай мовы і кітайскай культуры ў цэлым. Гэта нас вельмі збліжае. І зблізіць яшчэ больш, калі ў рамках запланаванага ў жніўні візіту ў Беларусь прэм'ер-міністра КНР будзе прынята рашэнне аб стварэнні беларуска-кітайскага цэнтра гуманітарнага супрацоўніцтва.

Немалаважны яшчэ адзін аспект — маладзёжны абмен. Усе разумеюць — каб спазнаць краіну, лепш убачыць яе на свае вочы. Таму падчас візіту ў Кітай дасягнулі яшчэ адной важнай дамоўленасці: падрыхтуем пагадненне, згодна з якім на пастаяннай, сістэмнай аснове будзем абменьвацца групамі школьнікаў і студэнтаў. Наведаўшы памятныя, гістарычныя, культурныя мясціны нашых краін, яны больш даведаюцца пра іх, ды і для асабістага сяброўства гэта будзе добрай нагодай.

Увогуле, дынаміка развіцця адносін з кітайскімі калегамі — надзвычай высокая. Мы давяраем адно аднаму самае каштоўнае, што ў нас ёсць, — нашу моладзь. Колькасць кітайскіх студэнтаў, якія навучаюцца ў Беларусі, толькі за пяць гадоў выросла з 6,5 да 11 тысяч. Два гады таму ў Кітаі вучыліся 150 нашых хлопцаў і дзяўчат. Цяпер — больш за дзве тысячы. А гэта азначае, што мы ўпэўненыя не толькі ў якасці адукацыі абедзвюх краін, але і ў тым, што дзеці знаходзяцца ў бяспецы, камфорце і сяброўскай атмасферы.

Педагагічныя кадры для Манголіі

Яшчэ адзін знакавы візіт прадстаўнікоў сістэмы адукацыі ў складзе ўрадавай дэлегацыі нашай краіны адбыўся ў Манголію.

Ён пачаўся з наведвання Мангольскага нацыянальнага ўніверсітэта адукацыі, дзе Андрэй Іванец і рэктар мангольскай ВНУ Батбаатар Джаміансурэн абмеркавалі ўзаемадзеянне паміж профільнымі ўніверсітэтамі. Асаблівая ўвага ўдзялялася перспектывам падрыхтоўкі педагагічных кадраў для Манголіі па прыродазнаўчанавуковых спецыяльнасцях. Андрэй Іванец выказаў гатоўнасць дзяліцца назапашаным вопытам па ўсіх кірунках, якія цікавяць мангольскі бок, у тым ліку па арганізацыі педагагічных класаў у школах.

Актывізацыя супрацоўніцтва ў падрыхтоўцы прафесійных кадраў для педагогікі і навукі ў цэлым — такая дамоўленасць была дасягнута паміж міністрамі адукацыі дзвюх краін. Таксама кіраўнік Міністэрства адукацыі і навукі Манголіі Энх-Амгалан Луўсанцэрэн пагадзіўся разгледзець пытанне ўдзелу беларускіх універсітэтаў у кароткатэрміновых адукацыйных праграмах. Дарэчы, сёння прамое ўзаемадзеянне паміж ВНУ Беларусі і Манголіі рэалізуецца ў рамках 12 міжуніверсітэцкіх дагавораў.

Галоўным вынікам мангольскіх сустрэч і перагавораў сталі падпісанне Пагаднення паміж урадамі Беларусі і Манголіі аб узаемным прызнанні дакументаў аб адукацыі, а таксама Дарожная карта супрацоўніцтва профільных міністэрстваў абедзвюх краін на 2024—2026 гады.

Сустрэча міністраў адукацыі краін БРІКС

Буйное міжнароднае мерапрыемства «Фарміруючы будучыню» з удзелам кіраўнікоў і спецыялістаў Міністэрства адукацыі прайшло ў Казані. На ім прысутнічала больш чым 100 удзельнікаў з 40 краін, якія прадстаўляюць палову насельніцтва планеты.

На форуме ўзніміліся пытанні міжнароднага адукацыйнага асяроддзя, сістэмы каштоўнасцяў, выхавання, ацэнкі якасці і даступнасці адукацыі. Падчас яго Андрэй Іванец сустрэўся з міністрам навукі і вышэйшай адукацыі Расіі Валерыем Фальковым. Кіраўнікі адукацыйных галін абмяркоўвалі пытанні стварэння сеткавага ўніверсітэта Саюзнай дзяржавы, аб'яднання намаганняў па сумесным удасканаленні інжынернай адукацыі. Сёння гэтая работа ідзе на базе Перадавой інжынернай школы Саюзнай дзяржавы — Пскоўскага ўніверсітэта. Абмеркавалі бакі таксама арганізацыю ў 2025 годзе Маладзёжнага форуму Саюзнай дзяржавы і фестывалю студэнцкай самадзейнай творчасці «Студэнцкая вясна Саюзнай дзяржавы».

У Казані таксама міністры адукацыі Беларусі і Егіпта дамовіліся аб супрацоўніцтве ў падрыхтоўцы кадраў па найбольш запатрабаваных у афрыканскай краіне спецыяльнасцях інжынернага профілю: у машынабудаванні, мікраэлектроніцы і гэтак далей. Нагадаем, што сёння прамое ўзаемадзеянне паміж установамі адукацыі Беларусі і Егіпта рэалізуецца ў рамках 11 дагавораў аб супрацоўніцтве.

Акрамя таго, прайшлі перагаворы з міністрам асветы Расійскай Федэрацыі Сяргеем Краўцовым і намеснікам міністра адукацыі Кітая Чэнь Цзэ, а таксама адбыліся сустрэчы з дэлегацыямі КНР, ПАР, Кубы, Рэспублікі Сербскай, Шры-Ланкі, Узбекістана.

Алена ВІНАГРАДАВА.
Фота прэс-службы Міністэрства адукацыі.

Яны размаўляюць на адной мове

Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

— Паміж Беларуссю і Кітаем устаноўлена ўсепагоднае і ўсебаковае стратэгічнае партнёрства, у яго аснове — узаемная павага, палітычны давер і сяброўства. У нас абсалютнае супадзенне — па ўсіх параметрах, па ўсіх сферах. І тое, што ўзаемадзеянне з КНР расце і ўмацоўваецца ў такой важнай галіне, як адукацыя, мае надзвычай важнае значэнне. Колькасць кітайскіх студэнтаў, якія навучаюцца ў Беларусі, пастаянна расце, прычым у апошнія гады ўсё больш з іх выказваюць жаданне перайсці на другі ўзровень адукацыі — магістратуру — і таксама ў нашых установах адукацыі. Гэта сведчыць аб тым, што краіна, якая прэтэндуе на лідарства ў свеце па многіх пазіцыях, прызнае не толькі якасць і камфортнасць навучання ў беларускіх ВНУ, але і бяспеку знаходжання ў беларускіх гарадах. Дзякуючы гуманітарнаму супрацоўніцтву, студэнты ў Кітаі загаварылі на нашай роднай мове, а беларуская моладзь — на кітайскай. Яны вучаць не толькі мовы, але і культуру, звычаі дзвюх краін. Але самае галоўнае ведаеце што? Тое, што насамрэч яны размаўляюць на адной мове — узаемнай павагі, роўнасці і высокіх агульначалавечых якасцяў.

Павысіць узровень гасціннасці

ТУР ПАЧЫНАЕЦЦА З ЭКСКУРСАВОДА

Нацыянальнае агенцтва па турызме адказвае за правядзенне прафесійнай атэстацыі экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, а менавіта за падрыхтоўку кадраў у гэтым сегменце. Яно праводзіць курсы — вячэрнія і завочныя — па навучанні экскурсаводаў, а таксама курсы для гідаў-перакладчыкаў. Рыхтуе і суправаджальнікаў турыстычных груп. На гэту восень запланавана адкрыццё дадатковых курсаў па падрыхтоўцы менеджараў, якія займаюцца ўязным і ўнутраным турызмам.

— Ёсць неабходнасць рыхтаваць новых спецыялістаў, бо нехта прыходзіць у прафесію, нехта сыходзіць. Цяпер на фоне росту зацікаўленасці ва ўнутраным і ўязным турызме расце патрэбнасць у перападрыхтоўцы кадраў, павышэнні іх кваліфікацыі, — адзначае **дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый МАРОЗАЎ**.

Фота з адкрытых крыніц.

Для больш эфектыўнай падрыхтоўкі тых, хто збіраецца прайсці прафесійную атэстацыю, стаць экскурсаводам, гідам-перакладчыкам, Нацыянальнае агенцтва па турызме выпускае матэрыялы па веданні гісторыі, культуры, геаграфіі Беларусі. Рэгулярна праводзяцца маркетынгавыя даследаванні, выбіраюцца найбольш актуальныя тэмы, якія можна будзе потым выкарыстоўваць у рабоце. Напрыклад, быў даследаваны патэнцыял выкарыстання ў турызме месцаў памяці, палацавых, замкавых, паркавых комплексаў, нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. У гэтым годзе плануецца выданне вынікаў даследавання па экалагічных сцежках. Таксама сёлета вядзецца даследаванне турыстычнага патэнцыялу прамысловых прадпрыемстваў.

Яшчэ адзін важны аспект — сертыфікацыя гасцінічных і турыстычных паслуг. На рэсурсах belarus.travel і belarustourism.by маецца інфармацыя аб усіх сертыфікаваных аб'ектах размяшчэння, кампаніях. На сайце belarus.travel у раздзеле турыстычных кампаній, якія займаюцца ўязным і ўнутраным турызмам, ёсць інфармацыя пра тых, хто прайшоў сертыфікацыю па дадзеных відах дзейнасці.

— Вельмі часта цікавяцца замежныя турыстычныя кампаніі, шукаюць, да каго можна звярнуцца наконт арганізацыі вандровак па Беларусі, але дзяржаўная ўстанова не можа даваць свае рэкамендацыі на падставе нейкай асабістай думкі. І якраз сертыфікацыя — гэта той інструмент, які дазваляе даваць афіцыйную інфармацыю, да каго можна звярнуцца для размяшчэння турыстычных груп, для фарміравання турыстычнага пакета па Беларусі. Гэтую працу, безумоўна, неабходна ўдасканальваць. Сертыфікацыя — гэта навігацыя, міжнародная сістэма каардынат, якая дазваляе і турыстам унутры Беларусі арыентавацца ў сваіх чаканнях адносна таго ўзроўню сэрвісу, які яны атрымаюць у тым ці іншым месцы пражывання. І, вядома ж, для замежных турыстаў гэта вельмі важна, каб супаставіць свае магчымасці і чаканні і не быць расчараванымі пасля таго, як апынуцца ў той ці іншай лакацыі, — звярнуў увагу дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме.

Дзмітрый Марозаў падкрэсліў, што калі размова ідзе аб сур'ёзных інфраструктурных пераўтварэннях — будаўніцтве новых якасных аб'ектаў размяшчэння, развіцці аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, то тут патрэбныя сур'ёзныя інвестыцыі — як прыватныя, так і дзяржаўныя. Але ў такіх укладанняў добрыя перспектывы, асабліва ў пэўных сегментах.

— У беларускіх санаторыях добрая карціна па суадносінах кошту і якасці паслуг — і загрузка 100-працэнтная. У сегменце аўтобуснага турызму бывае дастаткова складана знайсці вольныя месцы, вольныя аўтобусы, вольных экскурсаводаў, у пік сезона гэтых магутнасцяў далёка не заўсёды хапае. Таму вельмі актуальная падрыхтоўка новых кадраў, набыццё транспартных сродкаў, будаўніцтва гасцінічных, санаторных комплексаў, абнаўленне баз адпачынку. Перспектывы вельмі сур'ёзныя, гэта эканамічна мэтазгодна, — падсумаваў дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме.

АД ЧАГО ЗАЛЕЖЫЦЬ «ЗОРНАСЦЬ»?

Што датычыцца сертыфікацыі атэляў, то беларускія стандарты максімальна блізкія да расійскіх і зразумелыя для гасцей з гэтай краіны. Беларускі дзяржаўны інстытут стандартызацыі і сертыфікацыі з'яўляецца вядучым органам па сертыфікацыі гасцініц і аналагічных сродкаў размяшчэння. Адзіны стандарт быў распрацаваны для павышэння ўзроўню гасцінічнага абслугоўвання і прывядзення тэрміналогіі і патрабаванняў да гасцініц і аналагічных сродкаў размяшчэння ў адпаведнасць з расійскімі, еўрапейскімі і сусветнымі тэндэнцыямі. Ён дзейнічае з 2020 года.

Для класіфікацыі гасцініц прадстаўнікі акрэдытаванага органа па сертыфікацыі аглядаюць нумары, грамадскія зоны і службовыя памяшканні гасцініцы, ацэньваюць тэхнічны стан і аснашчэнне гасцініцы, нумарны фонд, персанал і якасць паслуг на адпаведнасць патрабаванням. Гэта робіцца ў чатыры этапы. Першы — ацэнка адпаведнасці гасцініцы адной з катэгорый. На другім этапе праводзіцца бальная ацэнка гасцініцы, на трэцім — бальная ацэнка персаналу. На чацвёртым этапе праводзіцца канчатковая ацэнка адпаведнасці гасцініцы заяўленай катэгорыі.

Самая нізкая катэгорыя — без зорак, але і тут ёсць базавыя патрабаванні да гасцініцы. Сярод іх — гарачая і халодная вада, ацяпленне і вентыляцыя, кругласутачны прыём гасцей, Wi-Fi у грамадскіх памяшканнях, ліфт, калі будынак вышэй за пяць паверхаў, змена пасцельнай бялізны раз на пяць дзён, рушнікоў (па два на госця) — раз у тры дні, а прыборка нумара — штодзень, уключаючы запраўку ложка. А вось да гасцініцы ў чатыры зоркі патрабаванняў куды больш: наяўнасць ліфта, калі будынак вышэй за два паверхі, кандыцыянеры ва ўсіх нумарах і грамадскіх памяшканнях, ахоўная сігналізацыя і сістэма відэаназірання, павышаная гукаізаляцыя ў нумарах, электронны замок у дзвярах, сейф, міні-бар ці міні-халадзільнік, набор пісьмовых прылад, шчыльныя шторы, якія забяспечваюць поўнае зацямненне, санвузел не менш чым тры кв. м, наяўнасць фена, чатырох рушнікоў на госця са штодзённай зменай і змена пасцельнай бялізны кожныя два дні. А таксама саўна і басейн, канферэнц-зала, кругласутачнае харчаванне, трэнажорная зала, магазіны, падноска багажа, швейцар і шмат іншага.

Як паведаміла начальнік аддзела сертыфікацыі паслуг Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі Таццяна Смірнова, на сёння ў Беларусі сертыфікаты адпаведнасці маюць 66 сродкаў размяшчэння. З іх «5 зорак» маюць пяць сродкаў размяшчэння, сярод якіх адзін санаторый, «4 зоркі» — 10, «3 зоркі» — 37, «2 зоркі» — 7, «без зорак» — 7 (з іх два хостэлы). У Брэсцкай вобласці сертыфікавана 9 сродкаў размяшчэння, у Віцебскай — 6, у Гомельскай — 4, у Гродзенскай — 3, у Мінскай — 5, у Магілёўскай — 6, у Мінску — 33. Афіцыйнае пацвярджэнне сваёй катэгорыі ў нашай краіне мае ўсяго 11 працэнтаў ад агульнай колькасці сродкаў размяшчэння, так што пакуль працэнт невялікі.

Цяпер сертыфікацыя гасцініц і аналагічных сродкаў размяшчэння з'яўляецца добраахвотнай. Увядзенне абавязковай сертыфікацыі беларускіх гасцініц пакуль што не плануецца.

ЯК ДАМАГЧЫСЯ КАМПЕНСАЦЫІ?

Кансультант Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Аляксандр КРЭЧАТАЎ расказаў, якія нюансы трэба ўлічыць пры заключэнні дагавора на аказанне турыстычных паслуг.

— Дапусцім, турыст хоча наведаць пэўную краіну і спыніцца ў пэўным месцы. Турыстычная кампанія павінна максімальна ўлічыць яго інтарэсы і склад неабходны дагавор, для якога ўстаноўлена тыпавая форма. Яна з'яўляецца абавязковай да прымянення, не дапускаецца выключэння якіх-небудзь умоў, але можна дапаўняць палажэннямі з улікам спецыфікі тура і работы турыстычнага аператара. Адна з абавязковых умоў дадзенага дагавора — праграма турыстычнага падарожжа, якая, па сутнасці, і з'яўляецца асноўнай меркай якасці паслугі. У праграме адлюстроўваецца інфармацыя аб сродках размяшчэння, перавозцы, паслугах харчавання, аб страхоўцы, калі яна неабходна, аб візавай падтрымцы, калі яна патрэбна для ўезду ў краіну. У праграме ўлічваюцца і іншыя характарыстыкі, калі такія маюцца ў тура. І гэта ў абавязковым парадку агаворваецца з турыстам пры заключэнні з ім дагавора, — расказаў Аляксандр Крэчатаў.

Важна таксама ўлічваць, што дагавор на аказанне турыстычных паслуг можа быць разлічаны на пэўную колькасць людзей — групу, сям'ю. Пры гэтым турысты, нават не з'яўляючыся бакамі дагавора, маюць усё тыя ж правы, што і заказчык. Гэта значыць на даванне паслуг у адпаведнасці з умовамі дагавора ў тым аб'ёме і ў тыя тэрміны, якія ў ім агавораны. І яны маюць права патрабаваць ад выканаўцы аказання гэтых паслуг у поўнай меры. Што рабіць, калі ўмовы не выконваюцца? Адказ ізноў жа ў дагаворы. Калі выканаўца не вытрымлівае аб'ём і якасць паслуг, то ён павінен зрабіць замену без змянення кошту на аналагічныя або больш высокай якасці паслугі. Або больш нізкай якасці, але з кампенсацыяй розніцы, звярнуў увагу суразмоўнік.

Ён таксама падказаў, на што трэба звярнуць увагу пры заключэнні дагавора на аказанне турыстычных паслуг. Па-першае, калі вы замовілі пэўны тур, то ў дагаворы ён павінен быць максімальна адлюстраваны ў праграме. Другая ўмова — кошт турыстычных паслуг. У адпаведнасці з законам аб турызме цяпер у дагаворы адлюстроўваецца не толькі сукупны кошт, але і кошт кожнай замоўленай паслугі. Яшчэ адна важная ўмова ў дагаворы — наяўнасць спосабу забеспячэння. Гэта датычыцца тых тураператараў, якія ажыццяўляюць туры за межы Беларусі. Гэта значыць, у выпадку ўзнікнення сітуацыі, калі тураператар не можа выканаць свае абавязацельствы, спрацоўвае так званы спосаб забеспячэння. Такіх спосабаў законам прадугледжана тры: страхаванне адказнасці, банкаўская гарантыя, фонд адказнасці тураператара. У дагаворы павінна быць указана, якая арганізацыя забяспечвае адказнасць тураператара, дзе яе месцазнаходжанне і які парадак звароту. Павінна быць таксама вызначана, якія расходы будуць пагашацца ў выпадку немагчымасці выканання.

ХТО ЯНЫ, ГОСЦІ БЕЛАРУСІ?

Хто ж тыповы турыст у нашай краіне? Як паказвае практыка Мінска, дзе склалі партрэт такога падарожніка, гэта госць, а дакладней, госця з Расіі сярэдняга ўзросту.

— Праведзена маркетынгавае даследаванне партрэта турыста Мінска, пры складанні якога выкарыстоўваліся даныя з апытання наведвальнікаў інфатурцэнтра «Мінск» і інфармацыя маркетынгавых службаў шэрагу гасцініц сталіцы. Вынікі паказалі, што 82 % гасцей сталіцы складаюць грамадзяне РФ пераважна жаночага полу (58 %) і ва ўзросце ад 28 да 52 гадоў (71 %). Тры чвэрці турыстаў паездку ў Мінск арганізоўвалі самастойна. Такія турысты ў большасці сваёй выкарыстоўваюць індывідуальныя сродкі размяшчэння, самастойна на месцы далучаюцца да зборных экскурсій, аддаюць перавагу індывідуальнаму наведванню турыстычных аб'ектаў, — расказала **начальнік аддзела маркетынгу турызму дзяржаўнай установы «Інфармацыйна-турысцкі цэнтр «Мінск» Анастасія КАЎРУС**.

У Мінску працуе 17 тэатраў, больш чым 30 музеяў і дзесяць галерэй. Распрацавана каля 40 праграм пешаходных і аўтобусных экскурсій, якія прапануюць тураператары. Для зручнасці турыстаў створаны дадатковыя стаянкі для турыстычных і экскурсійных аўтобусаў на тэрыторыі ў раёне дыспетчарскай станцыі «Дружная» і ў раёне Верхняга горада на вуліцы Леніна ад прыпыначнага пункта да вуліцы Інтэрнацыянальнай.

У беларускай сталіцы гасцей прымае больш чым шэсць тысяч аб'ектаў грамадскага харчавання, каля 200 з іх спецыялізуецца на нацыянальнай кухні. З канца мінулага года пачаў працаваць гандлёвы цэнтр тавараў беларускіх вытворцаў «Першы нацыянальны гандлёвы дом». Пашыраюцца і магчымасці прамысловага турызму, які дазваляе папулярызаваць айчынныя брэнды і наладзіць дзелавыя сувязі. Азнаёміцца з гісторыяй і арганізацыяй працы прапануе 21 прамысловае прадпрыемства горада.

У аматараў актыўнага адпачынку асаблівай папулярнасцю карыстаецца веласіпедны турызм. У 2024 годзе ў рамках конкурсу «Сталічны веламаршрут» распрацаваны і цяпер узгадняюцца велапешаходныя маршруты ў кожным адміністрацыйным раёне горада.

Актыўна развіваецца і водны турызм. Турыстычныя арганізацыі прапануюць гасцям і жыхарам горада праграмы сплаваў на байдарках, катанне на катамаранах, катэрах, сапбордах. У аматараў менш актыўнага адпачынку вялікай папулярнасцю карыстаюцца прагулкі на цеплаходзе па Камсамольскім возеры. А з гэтага года з'явілася магчымасць апрабаваць новы від транспарту, веласап — спалучэнне сапборда, веласіпеда і катамарана.

Алена КРАВЕЦ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Простая мова

ЧАЛАВЕКАМ МАЛА НАРАДЗІЦЦА
Ім яшчэ трэба стаць

І зноў што бачу.
Нядзеля, надвячорак, спальны раён сталіцы... Там стараватыя дамы, але ж новыя лаўкі ля пад'ездаў.
На адной — старэнькая бабуля, мусіць, заўсёдніца, бо ўсе з ёй вітаюцца, а нейкая жанчына дык нават падсаджваецца, заводзіць размову — досыць гучную (бабуля, падобна, недачувае?). А голас звініць — далятае да трэцяга паверха, «расчыняе» акно ў нейчай кухні.
— Шура, табе кабачкоў даць? — нясецца адтуль.
— Не, дзякуй... У нас свае ёсць, — адгукаецца бабуліна суразмоўца.
— А ў каго няма, ты не ведаеш?
— Не...
Акно зачыняецца.
У вяскоўцаў і дачнікаў дзве бяды: нешта НЕ ўрадзіла і... урадзіла. І адно не мёд і другое не рэдзька.

ШТО ТАКОЕ ДОБРА

Вечар, паўпусты тралейбус. На пярэднім сядзенні двое — мужчына і жанчына, магчыма, сужэнцы, бо яна так даверліва прытулілася да пляча... І гаворыць-гаворыць-гаворыць...

Міжволі слухаем: як яна ў абед матнулася ў краму, як убачыла там прыгожы касцюмчык, потым да яго яшчэ блузачку (расказ пра тканіну, колер, фасон, цану расцягнуўся на пяць прыпынкаў), што спадніцу — нават прымерала: і так яна добра «села»... Але ж не купіла — падумала...

— Што? Не будзе куды павесіць? — ціха пытае муж.

І тым самым нагадвае запіс «на сцяне»: «Учора з сынам рабіў урокі. Цяжэй — толькі з жонкай хадзіць па крамах».

БЫЛО Б ЖАДАННЕ

З дыялогаў у дзіцячым садку:

— Вой, Мая Іванаўна, у вас такія пазногці... Вострыя, доўгія...

— Табе падабаюцца? — удакладняе выхавацелька ў Вовачкі.

— Ну яшчэ б! З такімі на дрэва добра залазіць.

Гэта быў анекдот. Зараз — чыстая праўда.

Хлопец жаніцца надумаў, першы раз нявесту дадому прывёў. Бацькі з той прыемнай нагоды стол накрылі: частавалі дзяўчыну, распытвалі пра вучобу, сям'ю.

Тая расказвала і адказвала, хваліла стравы, парывалася дапамагчы гаспадыні... Спадабалася, карацей, і будучай свякрові са свёкрам, і юнай залоўцы, і кошцы...

Адна бабуля засмучонай была: перажывала, баялася, што бедным будзе яе ўнук, што не атрымаецца з гэтай дзяўчыны талковай жонкі...

Чаму?

Ды вы ж бачылі, маўляў, якія ручкі ў яе? А якія пазногці? Хіба ж яна, з вось такімі, нешта памые ды зварыць, хіба потым (даслоўна) «дзіцяці с. падатрэ»?

...Дзіўна, але факт: пры жаданні сённяшнія жанчыны ўсё гэта робяць, прычым — гуляючы: без «наступстваў» для пяшчотнай дзіцячай пятай кропачкі і... пазногцяў.

ПАСЕЕШ ПРЫВЫЧКУ — ПАЖНЕШ ХАРАКТАР...

Горад. Універмаг — паўпусты, здаецца? Аднак у «Мужчынскім абутку» хтосьці тармозіць — каля касы — чарга.

Перад намі — дзве пажылыя жанчыны, перад імі — маладзён у навушніках, са шкарпэткамі.

— Во, адну пару купляе, — заўважае старэйшая з кабет. — Дзівак...

— Ну чаму гэта «дзівак»? — не згаджаецца маладзейшая. — Можа, яму болей не трэба?

— Як гэта «не трэба»?.. Ды яшчэ і як! Адна шкарпэтка — ты ж ведаеш — хутка пратопчацца. Цыраваць яе моды няма. Значыць, цэлую следам выкіне — пойдзе ў магазін па новыя. А купіў бы пяць пар аднолькавых і клопату не меў... Мае мужчыны ўсе так рабілі — і муж, і сын, і абодвух зяцёў прывучыла...

Шкада, што хлопец быў у навушніках і размовы гэтай не чуў. Мо таксама прывык бы?

РОДНЫЯ? РОЗНЫЯ...

У сям'і было двое дзетак — хлопчык і... хлопчык.

Ён, малодшанькі, у пяць гадоў захварэў на анкалогію і памёр.

Бацькі — абодва медыкі — як не звар'яцелі!

І, можа, сапраўды, каб не крануцца розумам, нарадзілі дачушку — прыгажуньку, а ўжо ж пястушку... Для яе было ў доме ўсё: варта пачуць такое мілае «хачу-хачу!» — і на, дзіцятка, трымай — найлепшыя прысмакі, цацкі, строі. Любы капрыз...

Старэйшае дзіця бацькі, можна сказаць, не бачылі: яно існавала само па сабе ды як нянька для малодшага.

...Але ж гады прайшлі, і дзеці павырасталі: абое атрымалі адукацыю (дачка — за грошы), а сын — яшчэ і добрую, грашовую работу.

Менавіта ён дапамог бацькам «вылезці з хрушчоўкі» — пабудаваць і абставіць новую кватэру. Менавіта ён са сваёй сям'ёй да апошняга даглядаў састарэлых.

...Яны неяк рана пайшлі: абое, можна сказаць, раптоўна і адзін за адным. Тэстаменту, карацей, не пакінулі. Ды і навошта, калі ўсё было відавочным, само сабой зразумелым — і для іх, і для сына, і для... дачкі, якая была проста ўпэўнена, што ўся маёмасць — рухомая і нерухомая — павінна дастацца ёй.

Хіба не?!

Фота з адкрытых крыніц.

Больш за ўсіх дастаюць людзей акушэры.

«Абвалялася ў капрыз». З братам не бачацца і не размаўляюць.

За кватэру, дзе ніхто не жыве, плаціць ён.

...Янка Брыль некалі пісаў пра двух братоў-вяскоўцаў, якія акурат таксама гадамі (ці нават дзесяцігоддзямі) дзялілі бацькоўскую хату. І ўрэшце — ПАдзялілі так: распілавалі — уздоўж, паміж двума вокнамі.

Адзін з братоў разабраў сваю палавіну на дровы, другі — забіў дошкамі. І яна, вось такая, яшчэ доўга стаяла — помнікам дурнаце.

...Сёння такіх помнікаў, мусіць, безліч — і ў гарадах, і ў вёсках?

(Нехта з мудрых параду пакінуў: ніколі не гаварыць, што ведаеш чалавека, пакуль не дзяліў з ім спадчыну.)

ДА ЛЯМПАЧКІ

...Запальнічку для газавай пліты купляеш рэдка: паспрабуй — разбярыся, якая розніца паміж вунь той і гэтай.

Трэба спытаць у прадаўцоў.

Яны ўдвух (да слова, усё часцей хлопцы, маладыя мужчыны) досыць падрабязна тлумачаць... І, як высвятляецца, не толькі нам: побач нейкі дзядзька вушы навастрыў — разам з намі разглядае тавар, слухае і пры гэтым нават не маўчыць: хваліцца, «злавіўшы» паўзу, што таксама ведае беларускую мову, што яна — прыгожая і багатая, што на ёй трэба размаўляць — і начальству, і нам усім...

— А то ж, — даслоўна, — анідзе яе не пачуеш.

Трэба было сказаць чалавеку, што ён трохі памыляецца, бо людзі такія і былі, і ёсць... Але ж часу — вобмаль: толькі на тое, каб разлічыцца за абнову для кухні, каб падзякаваць прадаўцам. І, ужо сыходзячы, пачуць за спінай дзядзькава:

— Ребята, мне, пожалуйста, четыре лампочки...

«ЧАЛАВЕКАМ МАЛА НАРАДЗІЦЦА...»

Сіноптыкі падвялі — не сказалі пра дождж. Ды і скуль, здавалася, яму брацца: на небе ніводнай хмурынкі не было — калі ў трамвай садзіліся, а сабраліся выходзіць — залева, можна сказаць!

А следам — нялёгкі выбар: перачакаць гэтую навалу (парасон дома) і спазніцца на прыём да доктара? Альбо НЕ чакаць — прыйсці своечасова, але «прыгажунямі» — якіх свет не бачыў.

Мы выбіраем першае: гэта значыць, дабягаем да прыпынку, разам з іншымі займаем месца пад стрэшкай, пакорліва стаім — глядзім на дождж, на машыны, што праязджаюць, а хвілін праз 20, можна сказаць, праплываюць міма.

Што цікава, нехта з кіроўцаў на пад'ездзе да прыпынку, дзе стоўпіўся народ, скідвае хуткасць, каб, бронь божа, нікога не абліць вадой з-пад колаў, а нехта...

— Во якога прыдурка пранесла! — абураецца мужчына, тулячы да сябе малую ў бялюткіх туфліках, гольфіках і спаднічцы.

— Яшчэ двух, дзеда! — адгукаецца дзяўчынка, пасля чаго ці не ўвесь «натоўп» пад застрэшкам знаходзіць сабе нясумны занятак — падлічваць прыдуркаў і разумных.

Іх, апошніх, па нашых прыкідках, па той вуліцы праязджала больш.

А зрэшты — не факт: можа, іх дурату вада «збівала»?

...З Асадава дарэчнае тут:

Плохой ли,
хорошей рождается птица,
Ей всё равно суждено летать.
С человеком так же не случится,
Человеком мало родиться.
Им ещё надо стать.

УСЮДЫ ЛЮДЗІ...

Што новага на дачы, у Наташы лепей не пытаць, бо ў яе, па першае, не дача, а дом за горадам — з усімі выгодамі, з гаражамі, склепам, садам-агародам... А цяпер — яшчэ і суседам.

Ён, казала, нядаўна з'явіўся — малады, здаровы... Яна рада была: думала, ну нарэшце парадак навядзе, а то ж трава на ўчастку — можна сказаць, у пояс...

За суседам і сапраўды справа не стала: на свой першы пакос ён выйшаў у... шэсць гадзін раніцы, з трымерам (гэта касілка такая... Раве — гучней, чым трактар).

Не даў, карацей, паспаць — у законны выхадны.

Наташа, як прызнавалася, хацела выйсці і вельмі шмат што сказаць... Але ж неяк сцярпела — на першы раз...

Хіба што потым, пад абед, убачыўшы мужчыну на вуліцы, досыць далікатна заўважыла, што рабіць так — нядобра.

— Нядобра, — здзівіўся той. — Гэта ж каму?.. Вам? Затое мне — добра! Раніцай, па халадку, яно ж сама касіць! Потым горача будзе.

— Але ж побач, — паспрабавала даводзіць суседка, — людзі: недзе старыя, недзе малыя... Ім жа адпачываць ноччу трэба, а не касу вашу слухаць...

— Я вас пачуў, — абнадзеіў сусед і сваю другую касьбу распачаў... а пятай гадзіне раніцы.

...Цяпер Наташа ведае, што добры дзень на лецішчы — гэта калі свеціць сонца, спяваюць птушкі, цвітуць кветкі, а ў суседа (30 сотак зямлі) зламаўся трымер.

Гэта — па-першае. Па-другое, модная цяпер фраза: «я вас пачуў» азначае хутчэй не згоду, а нешта сярэдняе паміж ёй і такім жа «модным» «пайшла ты...»

Па-трэцяе, у горадзе міліцыя, у вёсцы ўчастковы без работы ніколі не будуць.

Дзіўная ўсё ж такі наша мова: сінонімы быццам, а якая велізарная розніца паміж людзьмі — блізкімі і недалёкімі.

Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж з упадабанага: слепы чалавек аддаў бы ўсё, каб убачыць, як заходзіць сонца, глухі — каб пачуць музыку, нямы — каб услых прачытаць малітву. А колькі паралізаваных людзей хацелі б зрабіць хоць некалькі рухаў...

Падумайце пра гэта ў наступны раз, калі падасца, што вы пакрыўджаны лёсам.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
31 ліпеня 2024 г. № 28 (761)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ

Стыхія зладзіла яе не толькі пабудовам, але і людзям

Дэпутат Стадоліцкага сельскага Савета дэпутатаў Ніна ПРЫБАЛАВЕЦ на сустрэчы з вяскоўцамі.

Дэпутат Бараўскога сельскага Савета дэпутатаў Рыгор БАРЫСАВЕЦ.

Дэпутат Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў Людміла АНДРЫЕЎСКАЯ і супрацоўнікі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва аказалі дапамогу вяскоўцам з аграгарадка Дуброва.

Фота Лельчыцкай раённай газеты «Светлае жыццё».

Старшыня Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў Таццяна БЯСПАЛАЯ ўдзельнічала ў ліквідацыі наступстваў стыхіі разам з ваеннаслужачымі з Мінска, Слуцка і Лунінца.

На Гомельшчыне працягваецца пастаянны кантроль сітуацыі ў населеных пунктах, пацярпелых ад стыхіі. Дэпутаты Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў, старшыні сельвыканкамаў працягваюць падамовыя абходы жыхароў на сваіх тэрыторыях: цікавяцца, чаго не хапае вяскоўцам, якая дапамога патрэбна. Уся сабраная інфармацыя перадаецца адказным службам. Асаблівая ўвага — пажылым людзям і сацыяльна ўразлівым катэгорыям грамадзян. Між тым дэпутаты дапамагаюць і фізічна — разам з вяскоўцамі добраўпарадкоўваюць населеныя пункты, сацыяльна значныя аб'екты, пацярпелыя ад урагану.

Дапамагалі адзін аднаму сем'ямі

«Згуртаваліся сусед з суседам, родныя, знаёмыя і вельмі дружна ўзяліся за справу», — аб тым, як хутка самаарганізаваліся, пачалі ўстараняць наступствы стыхіі на сваіх падворках, выпраўляць тое, што натварыў ураган, расказвае **старшыня Мілашэвіцкага сельвыканкама Лельчыцкага раёна Галіна ГАЎРЫЛАВЕЦ.**

На тэрыторыі яе сельсавета два буйныя аграгарадкі — Мілашэвічы і Прыбалавічы. Усяго пражывае 1400 чалавек. Працуюць: дзве сярэднія школы, два дзіцячыя садкі, урачэбная амбулаторыя, два дамы культуры і два сельгаспрадпрыемствы.

— Шчыра ўдзячна жыхарам свайго сельсавета. У нас не было ніякай панікі, ніякай азлобленасці, — дадае Галіна Пятроўна. — Так, непагадзь добра праверыла на трываласць, што і казаць. Пашкодзіла дамы, агароджы, гаспадарчыя пабудовы, нашы сацыяльна значныя аб'екты, грамадскія могілкі.

На тэрыторыі сельсавета працуе Мілашэвіцкі лясгас, які аказаў вяскоўцам неацэнную дапамогу ва ўстараненні наступстваў стыхіі: выдзелілі тэхніку і людзей.

— На вёсцы мы прывычныя, што ваду можна набраць з калодзежаў, а вось цяжкасці ўзніклі, безумоўна, з-за таго, што працяглы час не было электрычнасці. Многія хваляваліся, бо ў сем'ях і маразільнікі поўныя, і прыпасы, якія хутка псуюцца. Зноў жа людзі адзін аднаго не забылі. Калі прывезлі генератары, згуртоўваліся, прыносілі прадукты на захоўванне, — патлумачыла Галіна Гаўрылавец.

(Заканчэнне на 10-й стар.)

ЗВЯЗДА

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

Сенатары актыўна працуюць у рэгіёнах

2 жніўня 2024 г. з 12.00 да 13.00 намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Сяргей Мікалаевіч Хаменка правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб па адрасе: Магілёўская вобл., г. Кіраўск, вул. Кірава, 80 (Кіраўскі раённы выканаўчы камітэт). Папярэдні запіс ажыццяўляецца 31 ліпеня і 1 жніўня з 8.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00 па тэлефонах: 8 (02237) 7 91 61, 7 91 62.

● Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, галоўны ўрач Рэспубліканскага клінічнага медыцынскага цэнтра Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта Ірына Абельская і член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар Бярозаўскага раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі Таццяна Ігнацюк узялі ўдзел ва ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным 80-годдзю з дня заснавання Бярозаўскай цэнтральнай раённай бальніцы імя Э. Э. Вяржбіцкага.

У рамках урачыстых мерапрыемстваў адбылася сустрэча з адміністрацыяй і супрацоўнікамі ўстановы аховы здароўя. У адрас калектыву бальніцы прагучалі пажаданні моцнага здароўя, увасаблення ў рэальнасць усіх намечаных мэт, поспехаў, працвітання, новых здзяйсненняў на карысць пацыентаў і Рэспублікі Беларусь. З адміністрацыяй Бярозаўскай цэнтральнай раённай бальніцы былі абмеркаваны праблемныя пытанні і шляхі іх вырашэння.

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, генеральны дырэктар дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліве і газіфікацыі «Белпалівагаз» Аляксей Кушнарэнка сумесна з міністрам энергетыкі Віктарам Каранкевічам наведалі торфабрыкетны завод «Ляхавіцкі» і яго філіял «ТБЗ Каўпеніца».

Кіраўнікі азнаёміліся з праектам па глыбокай перапрацоўцы торфу і выпуску новых відаў вадкіх і сухіх гумінавых угнаенняў, што рэалізуюцца заводам сумесна з «Гандлёвым Домам Тарфяныя Гуматы». Новая імпартазамяшчальная прадукцыя з высокім утрыманнем гумінавых рэчываў прызначана для прымянення ў сельскай гаспадарцы для павелічэння ўраджайнасці і паляпшэння якасці сельгаскультур, а таксама павышэння ўрадлівасці глебы. Якасць угнаенняў паспяхова ўжо пратэсціравалі гаспадаркі ў розных рэгіёнах краіны. Вырашаюцца пытанні сертыфікацыі новай прадукцыі. Акрамя таго, дадаткова вывучаюцца магчымасці вытворчасці кансерванту для захоўвання сенажу і кармавой дабаўкі для буйной рагатай жывёлы на аснове вадкіх тарфяных гуматаў. Гэта работа вядзецца сумесна з Акадэміяй навук Беларусі.

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар Беларускага цэментнага завода Ігар Сяргееў ушанаваў перадавікоў-тысячнікаў уборачнай кампаніі філіяла № 1 «Цэмагра», які ўваходзіць у склад прадпрыемства, што ён узначальвае. «Дзякуючы зладжанай рабоце калектыву, уборку збожжавых культур плануецца завяршыць у найкарацейшыя тэрміны. Бо кожны разумее, што толькі адказны падыход да справы і ўзгодненыя дзеянні ўсяго калектыву прывядуць да поспеху. На такіх працавітых людзях трымаецца ўся нашая краіна», — адзначыў парламентарый. Ён падзякаваў работнікам за карпатлівую працу, адказныя адносіны да ўборкі ўраджаю, пажадаў моцнага здароўя і яшчэ большых дасягненняў у такой важнай і адказнай справе.

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

Сваімі ўражаннямі дзеляцца ўдзельнікі сёлетняга патрыятычнага праекта «Цягнік Памяці» з розных рэгіёнаў Беларусі

ПА МАРШРУЦЕ

«Цягнік Памяці» я запомню на ўсё жыццё»

«Мне вельмі запомнілася наша паездка ў Брэст — пачатак нашага падарожжа. Там ноччу 22 чэрвеня для нас арганізавалі экскурсію ў Брэсцкую крэпасць, — дзеліцца ўражаннямі **вучаніца мінскай гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны Дар'я ВАСІЛЬЕВА.** — Затым адбыўся дыялог са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай, які я запомню на ўсё жыццё. Разам з першым сакратаром Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандрам Лук'янавым нам распавялі пра канцэпцыю праекта «Цягнік Памяці», пра важнасць дружбы і аб'яднання маладых людзей, народаў».

Дзяўчыне асабліва запомніўся парк «Патрыёт», які знаходзіцца ў Кубінцы. «Унікальная канцэпцыя «Музейна-храмавага комплексу УС РФ» — гэта падрабязная гісторыя кожнага дня Вялікай Айчыннай вайны. Усе яны былі максімальна падрабязна распісаны... А дзякуючы ўнікальнаму архіву, у базе якога каля трох мільёнаў савецкіх салдат, я змагла адшукаць і свайго прадзеда. Практычна кожны з нас знайшоў сваякоў, якія ваявалі, а гэта — вельмі важна! Ды і ў цэлым тут было даволі атмасферна: спачатку нас павялі па гістарычных залах, затым — па інтэрактыўных. Вельмі рэалістычна была рэканструявана Сталінградская бітва, Дом Паўлава і іншыя вялікія бітвы часоў вайны», — расказала Дар'я. Таксама дзяўчыне вельмі спадабалася ў Архангельску.

Дар'я Васільева з гонарам расказвае, што ўсім замежным гасцям вельмі спадабалася наша краіна. «Дзяўчынка з Расіі настолькі захапілася нашай Нацыянальнай бібліятэкай, што па вяртанні дадому перш за ўсё адправілася ў сваю Пермскую бібліятэку і ўзяла шмат мастацкай літаратуры», — расказвае яна. «Праект «Цягнік Памяці» я запомню на ўсё жыццё», — гаворыць дзяўчына.

Вучань сталічнай сярэдняй школы №137 імя П. М. Машэрава Цімафей ІВАШКЕВІЧ — таксама пасажыр «Цягніка Памяці». Малады чалавек падпісаны на тэлеграм-канал «Звязды», з'яўляецца пастаянным чытачом нашай газеты. Перапоўнены непадробнымі эмоцыямі аб удзеле ў праекце, нягледзячы на непагадзь, ён прыехаў да нас у рэдакцыю, каб падзяліцца падрабязнасцямі іх унікальнага падарожжа. У якое, як і ўсе астатнія ўдзельнікі, ён трапіў невыпадкова. Хлопец удзельнічаў у маладзёжным праекце «100 ідэй для Беларусі», рэспубліканскіх алімпіядах, быў вядучым некаторых гарадскіх мерапрыемстваў. У эсэ «Аб той вясне...» ён распавёў пра подзвігі свайго прадзядулі — удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, які ў баях пад Арлом страціў руку... А візітоўку прадставіў у вершаванай форме.

Уразіла, па словах Цімафея, многае — і ўрачыстае адкрыццё праекта, якое адбылося ў Брэсце, і сустрэча са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай, і рэканструкцыя пачатку вайны ў Брэсцкай крэпасці. Далей па маршруце былі Белавежская пушча, Гродна, Полацк, Санкт-Пецярбург, Архангельск, Волагда, Масква, парк «Патрыёт» у Кубінцы, Валгаград, Магілёў, Гомель і Мінск. «Незабыўныя ўражанні пакінуў Сафійскі сабор у Полацку. Там вельмі прыгожа! Ды і астатнім вельмі спадабалася ў Беларусі. Многія адзначалі нашу вядомую гасціннасць, — расказаў Цімафей. — У сваю чаргу мы таксама па заслугах ацанілі прыгажосць Расіі. Асабліва спадабаўся парк «Патрыёт», у якім мы спявалі песні каля вогнішча і танцавалі. У Петразаводску хадзілі па набярэжнай Анежскага возера. І там таксама вельмі прыгожа!»

Полацкі ДУЛАГ, Мамаеў курган, Піскароўскія мемарыяльныя могілкі, Магіла Невядомага салдата ў Маскве — толькі малая частка тых знакавых месцаў, дзе пабывалі ўдзельнікі праекта падчас свайго падарожжа. «Асабліва запомніўся Крэмль, уразілі Цар-гармата, Цар-звон, Саборная плошча, развадныя масты ў Піцеры. Столькі прыгожых месцаў мы наведалі ўсяго за 14 дзён, нават у галаве не ўкладваецца! Графік быў вельмі шчыльны, у Магілёве і Гомелі мы пабывалі за адзін дзень і шмат чаго ўбачылі...»

Па словах Цімафея, «Цягнік Памяці» для ўдзельнікаў стаў другім домам. Многія спачатку асцерагаліся: «А як гэта мы будзем жыць два тыдні ў цягніку, якія там могуць быць умовы?» Аднак усе асцярогі аказаліся дарэмнымі», — сказаў хлопец. — Аляксандр Лук'янаў прапанаваў увесці такую традыцыю: усе мы павінны былі гаварыць «Добрай раніцы» на сваёй роднай мове. Ну і ў цэлым у «Цягніку Памяці» панавала сяброўская атмасфера. З многімі падтрымліваем кантакт і сёння. Штодня ў агульным чаце ў сацыяльнай сетцы прыходзіць больш за 100 паведамленняў!»

«Для мяне за гонар было расказаць новым сябрам, што я кадэт»

Кірыл ХАЛДОБА сваю паездку ў «Цягніку Памяці» ўспамінае як свята. Шмат эмоцый, уражанняў, знаёмстваў.

Кірыл абраў для сябе мужчынскую прафесію, ён вучыцца ў Магілёўскім абласным кадэцкім вучылішчы імя Героя Савецкага Саюза Яўгена Нікалаенкі, дзе жыццё ідзе строга па распарадку, а дысцыпліна і адказнасць не проста словы. Яму падабаецца такі стыль жыцця, і ён робіць усё дзеля таго, каб быць першым. Яго фота вісіць у вучылішчы на Дошцы гонару. Ён старшы віцэ-сяржант, намеснік камандзіра ўзвода, сакратар пярвічкі БРСМ вучылішча. У яго шмат заслуг у спорце і грамадскай дзейнасці. У будучым бачыць сябе афіцэрам, выпускніком Ваеннай акадэміі. Ганарыцца тым, што будзе абараняць Радзіму. А яшчэ тым, што яго юнацтва праходзіць у «пунсовых» кадэцкіх пагонах.

— Званне кадэта — гэта на ўсё жыццё, — гаворыць Кірыл. Вучылішча дае не толькі шмат новых ведаў, але і дапамагае развіцца фізічна. Я ўваходжу ў каманду па мнагабор'і. А яшчэ я экскурсавод і вядучы. Тут запатрабаваныя мае камандзірскія, творчыя таленты. Цяпер рыхтуюся ўзяць на сябе абавязкі старшыні вучылішча, што для мяне — вялікі гонар. Усё гэта мне дала мая навучальная ўстанова. У тым ліку і магчымасць паўдзельнічаць у такім маштабным інтэрнацыянальным праекце.

У купэ «Цягніка Памяці» разам з Кірылам ехалі школьнікі, якія за час паездкі сталі сапраўднымі яго сябрамі. Яны нават асобны чат стварылі, дзе зараз абменьваюцца інфармацыяй. Лявон Шахназаран родам з Арменіі, Сардор Бурханаў — з Кыргызстана, Кірыл Плятнёў з Расіі — не толькі цёзка суразмоўцы, але і таксама кадэт. Кірыл усміхаецца, што за два тыдні дарогі шмат чаго даведаўся з жыцця дружалюбных краін. Што, напрыклад, у Арменіі ў школах вучацца не 11 гадоў, як у Беларусі, а 12. Армянін Лявон у будучым збіраецца стаць хірургам, вучыцца ў медыцынскім класе і нават у дарозе паспяваў рабіць заданні, якія яму дасылалі па інтэрнэце. Цікавым падалося і тое, што мусульмане, кім з'яўляецца Сардор Бурханаў, без малітвы наогул не садзяцца за стол. І меню іх крыху адрозніваецца ад звычайнага. Для іх у паездцы нават стравы падбіралі асобна.

Нягледзячы на знешнія адрозненні, юных вандроўнікаў аб'ядноўвае памяць пра агульнае трагічнае ваеннае мінулае. Падчас паездкі атрымалася наведаць шмат розных месцаў воінскай славы, якія не маглі не ўразіць. Кірыл успамінае велічны манумент у Валгаградзе «Радзіма-маці кліча». І тое трапятанне, якое адчуў, калі да манумента ўскладаў кветкі.

Суразмоўнік вельмі любіць свой родны горад, і калі ўдзельнікі «Цягніка Памяці» наведвалі ў Магілёве Буйніцкае поле, адчуў гонар за сваю малую радзіму, за кадэтаў.

— На Буйніцкім полі нас сустракалі першакурснікі майго кадэцкага вучылішча, — кажа ён. — Гэта былі вельмі кранальныя хвіліны, я шчаслівы, што належу да гэтага братэрства, што мы адна сям'я. Яны трымалі ў руках партрэты нашых гераічных прадзедаў, і гэта было вельмі сімвалічна. Буйніцкае поле — сэрца Магілёва, у такіх месцах асабліва адчуваецца сувязь з нашымі гераічнымі продкамі, удзячнасць за тое, што яны падарылі нам мір.

Асаблівыя пачуцці выклікала ў Кірыла і наведванне Хатыні. Гэта месца агульнага смутку, дзе амаль фізічна адчуваецца боль за тых людзей, жыцці якіх абарвала бязлітасная варожая рука.

— Ад паездкі на «Цягніку Памяці» засталося шмат прыемных успамінаў, мы наведалі мноства знакавых воінскіх месцаў, якія для мяне як кадэта вельмі важныя і цікавыя. Усе мерапрыемствы і сустрэчы былі нацэленыя на тое, каб аб'яднаць моладзь розных краін. І калі мы прыязджалі ў новыя гарады, шмат часу праводзілі з мясцовай моладдзю. Для нас рыхтавалі мерапрыемствы, было вельмі пазнавальна.

«Паездка дала магчымасць яшчэ больш адчуць сябе патрыётам сваёй краіны»

Каб трапіць у лік пасажыраў, гродзенец Данііл ШЫЛА, як і ўсе ўдзельнікі праекта, прайшоў даволі жорсткі адбор. Мы сустрэліся з ім каля яго роднай 10-й гімназіі, якая носіць імя мітрапаліта Філарэта. Юнак прыйшоў у летнім аддзенні з лагатыпам Цягніка Памяці. Па ўсім відаць, што ганарыцца сваім удзелам у міжнародным праекце. І нездарма. Данііл — адзіны прадстаўнік абласнога цэнтра, які трапіў у гэту незвычайную паездку.

Фота аўтара.

Трапіў, варта адзначыць, заслужана. Хлопец захапляецца матэматыкай, удзельнічаў у рэспубліканскім этапе прадметнай алімпіяды. Таксама Данііл пастаянны ўдзельнік канцэртаў і вакальных конкурсаў, нядаўна ён стаў пераможцам музычнага конкурсу «Нёманская артхваля». Але будучыню сваю звязвае з тэхнічным кірункам — плануе паступаць у БДУІР на факультэт камп'ютарных сістэм і сетак.

— Давайце прыгадаем ваша падарожжа на «Цягніку Памяці». Гэта паездка была даволі доўгай і насычанай. Вам ужо даводзілася выязджаць на такі тэрмін далёка ад дома?

— Мы з бацькамі часта падарожнічаем, асабліва па Беларусі, у нас шмат цікавых месцаў, якія варта наведаць. Але такіх доўгіх падарожжаў у мяне яшчэ не было. Мы праехалі звыш дзевяці тысяч кіламетраў. Гэта два тыдні ў цягніку. Але праграма была настолькі насычаная, што час ішоў вельмі хутка.

— Што было самае цікавае ў маршруце і, магчыма, паўплывала на новае ўспрыманне даўно вядомага?

— На мой погляд, адным з самых важных пунктаў маршруту быў расійскі горад Валгаград. Мяне ўразіла ўся праграма. Мы наведалі Мамаеў курган з велічным манументам Радзімы-маці, музей Сталінградскай бітвы, які адкрыў для мяне новыя старонкі той пераломнай бітвы, таму што я многага не ведаў. Яшчэ вельмі цікавым прыпынкам маршруту быў беларускі Полацк. І хоць я быў там, але не ведаў, напрыклад, пра канцлагер. У мемарыяльным комплексе нам паказалі тэатральную пастаноўку, якая ўсіх вельмі ўразіла. Многія ўдзельнікі праекта гэта адзначылі. Мы атрымалі вялікае натхненне ад ваеннага парада ў Мінску падчас святкавання Дня Незалежнасці. Таксама запомніліся сустрэчы са Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталляй Качанавай і старшынёй Савета Федэрацыі Расіі Валянцінай Матвіенка. У нас адбыліся адкрытыя дыялогі, мы змаглі задаць пытанні, пачуць іх меркаванні, даведацца аб тых ідэях, якія закладваюцца ў гэты праект.

— Як вы наладжвалі адносіны з прадстаўнікамі іншых краін? Ці стаў цягнік пляцоўкай для калектыўных кантактаў?

— Вядома, стаў. Мы правялі разам шмат часу, усе былі максімальна адкрытыя ў плане кантактаў, незалежна ад таго, з якой краіны яны прыехалі. Мы адрозніваемся па менталітэце, але з усімі было прыемна кантактаваць і даведацца шмат цікавага. Наш атрад стварыў сваю групу ў месенджары, мы актыўна перапісваемся, не губляем сувязі і цяпер.

— Ці адчувалася, што паездка стала для ўсіх незабыўнай падзеяй?

— Паездка маштабная і цікавая для ўсіх удзельнікаў. Аб гэтым сведчыць і момант развітання, калі замежныя ўдзельнікі адпраўляліся ў Масвкву, а потым па сваіх краінах і адрасах. Ніхто не хацеў ад'язджаць, мы доўга развітваліся ў Мінску. Гэта была фінальная кропка, і відавочна было, наколькі ўсе ўзрушаны.

— Што важнага для сябе вы вынеслі з праекта?

— Паездка дала магчымасць яшчэ больш адчуць сябе патрыётам сваёй краіны. Такія праекты важныя для моладзі. Мы можам расказаць іншым, каб яны імкнуліся заваяваць такую пуцёўку. Патрыятычна настроенай моладзі ў нас вельмі шмат. І, каб быць патрыётам, неабавязкова адпраўляцца ў паездку, такое падарожжа дапамагае ўмацаваць грамадзянскую пазіцыю.

СЯБРОЎСТВА І ПАМЯЦІ

«У нас была мэта, якая аб'ядноўвала»

Пасажырам «Цягніка Памяці» сёлета выпаў гонар стаць **старшынямі Маладзёжнага парламента горада Слуцка, вучаніцы першай гарадской гімназіі Анастасіі АЖЭЎСКАЙ.** «Быў даволі сур'ёзны адбор, які складаўся з некалькіх этапаў: школьны, раённы, абласны і рэспубліканскі. Неабходна было напісаць эсэ на тэму «Аб той вясне...», расказаць пра сваіх сваякоў і землякоў, якія ўнеслі ўклад у перамогу над фашызмам. Затым мы прэзентавалі візітную картку, відэаролік, у якім распавядалі пра сябе і свае дасягненні. Завяршальным этапам стала творчае партфоліа, якое ўключала ў сябе розныя ўзнагароды і дыпломы. Па выніках усіх выпрабаванняў я і трапіла на «Цягнік Памяці», — распавяла Анастасія.

Асабліва яе ўразіла падарожжа па гарадах Расійскай Федэрацыі. «Санкт-Пецярбург і Пецяргоф падарылі мноства незабыўных эмоцый. Таксама наведалі і Маскву, дзе ўсклалі кветкі да Магілы невядомага салдата, пабывалі і ў Крамлі. Далей на нашым шляху сустрэліся такія гарады, як Архангельск і Валгаград. Асабліва мне запомніўся парк «Патрыёт» — унікальны комплекс, які знаходзіцца ў Падмаскоўі. Там мы наведалі Музейна-храмавы комплекс Узброеных Сіл Расіі», — дзеліцца ўражаннямі Анастасія.

Па яе словах, дзякуючы гэтаму ўнікальнаму праекту кожны змог здабыць новыя знаёмствы. «Мы разам з удзельнікамі ўвесь гэты час падарожнічалі, палілі вогнішчы, спявалі песні пад гітару. Цяпер у мяне з'явіліся сябры не толькі з нашай краіны, але і з Расіі ды Узбекістана. Нягледзячы на нашы пэўныя адрозненні, у нас была мэта, якая аб'ядноўвала нас — наведаць помнікі ваенных гадоў, даведацца новае пра гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Цяжка было і расставацца з новымі сябрамі. Стоячы на пероне, са слязамі на вачах мы праводзілі нашых гасцей, да якіх за гэтыя 14 дзён моцна прывыклі і прывязаліся», — дадала дзяўчына.

Прыняць удзел у праекце «Цягнік Памяці» нашаму наступнаму суразмоўцу прапанавалі ў школе. **Вучань Нарачскай сярэдняй школы Вілейскага раёна Глеб КЛІМОВІЧ** таксама падзяліўся сваімі ўражаннямі пра паездку: «З экскурсіяй мы наведалі Брэсцкую крэпасць. Затым паехалі ў Гродна — адзін з найпрыгажэйшых гарадоў нашай краіны. Падчас пешай прагулкі па старажытным горадзе наведалі мясцовыя храмы, Стары і Новы замкі. Акрамя абласных гарадоў нашай краіны, мы наведалі Маскву, Санкт-Пецярбург, Петразаводск, Архангельск, Валгаград. Асабліва мне запомніліся разводныя піцерскія масты і Піскароўскія мемарыяльныя могілкі — журботны помнік ахвярам Вялікай Айчыннай вайны, сведка агульначалавечай трагедыі і месца ўсеагульнага пакланення», — адзначыў малады чалавек.

«У адным купэ са мной ехалі хлопцы з Расіі, Кыргызстана і Арменіі. З імі, зразумела, пасябравалі асабліва моцна. Ды і з іншымі ўдзельнікамі праекта кантакт не абрываецца — і сёння мы актыўна перапісваемся ў сацыяльнай сетцы», — дадаў Глеб.

«Гэты праект не толькі аб'ядноўвае людзей і цэлыя народы. Ён накіраваны яшчэ на тое, каб мы не забывалі пра подзвіг нашых продкаў, памяталі пра тую страшную трагедыю — Вялікую Айчынную вайну — і не дапусцілі, каб наша зямля зноў зведала такую трагедыю», — зусім па-даросламу разважае Глеб Клімовіч.

«Мы шчыра пасябравалі»

Анастасія ГАРБАР скончыла дзесяць класаў сярэдняй школы № 11 горада Мазыра. Як кажуць, таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Дзяўчына — уладальніца Гран-пры Рэспубліканскага конкурсу «Піянер года — 2022», прызёр абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу «СуперТройка», пераможца абласнога конкурсу піянерскіх агітбрыгад, шматразовая пераможца абласнога этапу конкурсу «Ратавальнікі вачыма дзяцей», лідар раённага этапу конкурсу «100 ідэй для Беларусі». А яшчэ Анастасія — намеснік старшыні вучнёўскага самакіравання «КУБ», удзельніца школьнага тэатра «Пераадоленне» і танцавальнага калектыву. Цяпер у скарбонцы поспехаў дзяўчыны — перамога ў рэспубліканскім конкурсе «Я патрыёт сваёй краіны» ў рамках беларуска-расійскага праекта «Цягнік Памяці», які і падараваў магчымасць выправіцца ў першае вялікае падарожжа.

— Вельмі шмат часу праводжу ў школе: вучоба, грамадскае жыццё плюс рэпетыцыі ў нашым школьным калектыве «Людзі». З класа я адна, хто вырашыў спаборнічаць за ўдзел у праекце. Падчас адборачнага тура пісала эсэ пра майго прадзеда па мамінай лініі — Дзям'яна Давыдзенку. Ён прайшоў вайну і вярнуўся з фронту жывым. Калі рыхтавала эсэ, мае мама з татам дзяліліся сваімі ўспамінамі, расказвалі аб Вялікай Айчыннай вайне тое, што чулі ад жывых яе ўдзельнікаў. Мне было вельмі цікавае гэтае заданне, — распавяла Анастасія.

Школьніца падзялілася, што падчас адборачнага этапу на абласным узроўні для яе быў даволі складаным квіз: удзельнікі не ведалі да канца тэмы пытанняў. Калі ж мазыранка ўбачыла сябе ў ліку ўдзельнікаў «Цягніка Памяці», безумоўна, вельмі ўзрадавалася. Радаваліся за яе і бацькі, і малодшы брацік.

— Я ніколі нікуды не ездзіла адна так далёка, і гэта было ўвогуле першае такое падарожжа, — патлумачыла дзяўчына. — На маршруце па-сапраўднаму запала ў сэрца месца, дзе не магла стрымаць слёз. Гэта наш мемарыяльны комплекс «Хатынь». Я ніколі не была на гэтым месцы памяці раней, і яно вельмі эмацыянальна на мяне паўплывала. Упэўнена, што там абавязкова павінен пабываць кожны, каб зразумець, прачуць трагедыю смерці ні ў чым не вінаватых людзей, бесчалавечнасці вайны. На маршруце ўжо падчас руху па тэрыторыі Расіі вельмі спадабаўся галоўны храм Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі ў Кубінцы Маскоўскай вобласці, — дадала мазыранка.

З кожнага горада на маршруце яна адпраўляла паштоўкі дадому — прывітанні з «Цягніка Памяці».

— Больш за ўсё ў праекце мне спадабалася, што ён дае магчымасць пасябраваць з аднагодкамі з розных краін, юнакамі і дзяўчатамі розных нацыянальнасцяў. Гэта было вельмі цікава. У мяне ў атрадзе былі дзяўчаты і хлопцы з Расіі, Таджыкістана, Казахстана, Азербайджана. Мы шчыра пасябравалі. Калі быў вольны час увечары, збіраліся, размаўлялі, дзяліліся сямейнымі гісторыямі, расказвалі, якія ў каго на радзіме традыцыі. Цікава было дазнацца пра вясельныя традыцыі ад дзяўчат. Усе імкнуліся навучыць, як прывітацца, спытаць «як справы?» на іх роднай мове. Мяне ж таксама прасілі навучыць, як вітацца

па-беларуску; прасілі больш размаўляць на роднай мове, бо падабаецца наша гаворка. Цікава, што першае, аб чым пыталіся, калі дазнаваліся, што я з Беларусі: ці сапраўды так любім бульбу і ці шмат яе ядзім, — смяецца дзяўчына.

Дарэчы, калі школьніца вярнулася ў родны Мазыр, сустракалі яе не толькі блізкія, але і дырэктар школы, настаўнікі, педагогі-арганізатары, аднакласнікі.

— Расказвала пра падарожжа, дзялілася ўражаннямі ад наведвання знакавых месцаў, — распавяла Анастасія. — Увесь наш атрад з «Цягніка Памяці» да гэтага часу, лічы, не расставаўся. Бо мы стварылі агульны чат, перапісваемся, абменьваемся фатаграфіямі. Марым усе разам сустрэцца зноў. Нават прасілі пра гэта арганізатараў праекта, і былі б вельмі рады магчымасці арганізаваць сустрэчу ў Мінску ці Гомелі, — дадала дзяўчына.

Анастасія марыць паступіць у БНТУ на факультэт маркетынгу, менеджменту і прадпрымальніцтва. Удзел у праекце «Цягнік Памяці», перакананая дзяўчына, — неацэнны вопыт. Ён абагачае юнакоў і дзяўчат не толькі ў культурным плане, але і дае магчымасць стаць больш камунікабельнымі, упэўненымі ў сабе, развівацца як цікавы суразмоўца і, што важна, станавіцца годным грамадзянінам сваёй краіны.

«Мы павінны помніць, якой цаной завааяваны мір»

Праехацца на «Цягніку Памяці» пастаўчанін Захар КАНАШ марыў два гады. У мемарыяльным комплексе «Курган Славы» ён пазнаёміўся з удзельнікамі першага праекта і даведаўся, якія месцы яны наведалі. Хлопца натхнілі аповеды аднагодкаў, бо Захар цікавіцца гісторыяй сваёй малой радзімы, Вялікай Айчыннай вайны і Беларусі.

Дзякуючы імкненню маладога чалавека, а таксама падтрымцы адміністрацыі, педагагічнага калектыву школы і сяброў-аднадумцаў з ваенна-патрыятычнага клуба «Патрыёт», мара хлопца спраўдзілася. У клубе «Патрыёт» ён разам з іншымі школьнікамі праводзіць вялікую работу па выяўленні невядомых фактаў пра ваенныя падзеі ў Пастаўскім раёне. У горадзе знаходзяцца дзве брацкія магілы, і члены клуба ўстанаўліваюць імёны пахаваных там байцоў.

Ваенныя ліхалецці саракавых закранулі і яго сям'ю, прабабуля Надзея Юшкевіч знаходзілася ў партызанскай брыгадзе ва Ушацкім раёне, у 1944 годзе брала ўдзел у аперацыі «Баграціён». «У яе ёсць ордэн Айчыннай вайны. На жаль, прабабуля не дажыла да майго нараджэння, аднак пра яе мне распавядалі бабуля і бацька. Па словах прабабулі, людзі падчас прарыву ў раёне Ушачаў падалі намертва, нібы дрэвы пасля ўрагану, таму што на іх ішоў суцэльны град куль і асколкаў», — расказаў герой гісторыю сваёй сям'і.

4 ліпеня, праехаўшы дзевяць тысяч кіламетраў па Беларусі і Расіі разам з прадстаўнікамі Арменіі, Азербайджана, Казахстана, Узбекістана, Кыргызстана, Таджыкістана, Захар Канаш вярнуўся дадому. І ўжо 10 ліпеня, у рамках новага сезона рэспубліканскай інфармацыйна-асветніцкай акцыі «Крок да поспеху», ён дзяліўся свежымі эмоцыямі са сваімі аднакласнікамі і сябрамі на базе чацвёртай школы г. Паставы.

Захар успамінае, што атрымаў ад падарожжа больш эмоцый, чым чакаў першапачаткова. «Мы наведалі 13 гарадоў Беларусі і Расіі, якія звязаны адной балючай гісторыяй — Вялікай Айчыннай вайной. Мне, як члену ваенна-патрыятычнага клуба, было важна ўбачыць на свае вочы знакавыя мясціны, дзе здзяйснялі подзвігі пагранічнікі. Некаторыя з такіх прыпынкаў пакінулі ў маёй душы яркі след», — дзеліцца герой.

22 чэрвеня ўдзельнікі «Цягніка Памяці» сустрэліся ў Брэсцкай крэпасці, горад-герой стаў адпраўным пунктам 14-дзённага падарожжа. У Полацку моладзь наведала мемарыяльны комплекс памяці ахвяр фашызму «Урочышча «Пяскі» , дзе пахавана каля 100 тысяч савецкіх ваенна-палонных і мірных жыхароў. Асабліва адлюстраваліся ў памяці маладога чалавека горад Валгаград і легендарны манумент «Радзіма-маці кліча!». Слязамі на вачах адгукалася цішыня на Мамаевым кургане. Найбольш уразілі хлопца неабсяжныя памеры Піскароўскіх мемарыяльных могілак, дзе пахаваны ахвяры 872-дзённай блакады Ленінграда. Апошнім горадам стаў Мінск, дзе святкавалася 80-я гадавіна вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Моладзь наведала мемарыяльны комплекс «Хатынь» і новы музей, прысвечаны сакавіцкай трагедыі 1943 года, калі вёска стала вогненнай.

«У прыгарадзе Кубінкі з намі сустрэлася старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Валянціна Матвіенка, а ў апошні дзень праекта ў сталіцы нашай краіны з удзельнікамі «Цягніка Памяці — 2024» сустрэлася Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Качанава. Вельмі прыемна і пачэсна быць у ліку ўдзельнікаў такога грандыёзнага і вельмі важнага для моладзі праекта. Мы павінны помніць, якой цаной завааяны мір», — заключыў Захар.

Нэлі ЗІГУЛЯ, Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, Маргарыта УШКЕВІЧ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА. Фота з архіваў герояў.

ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Галіна Пятроўна распавяла, як дружна спрацавалі яе вяскоўцы і падчас рамонту дахаў сваіх дамоў. Дапамагалі адзін аднаму сем'ямі.

— Для людзей па заяўках прывозіла на дом шыфер з раёна будаўнічая арганізацыя. Каму патрэбны — у наяўнасці і ў нашай краме спажыўтаварыства, ёсць таксама дастаўка, — дадае старшыня сельвыканкама. — Людзі адзін аднаму значна дапамаглі і ў рамонце агароджаў, бо вельмі шмат пашкоджанняў такога плану ў нас было.

На тэрыторыі гэтага сельсавета, сапраўды, шмат дзе была неабходна дапамога. Каб навесці парадак пасля стыхіі на сацыяльна значных аб'ектах, патрабаваліся і тэхніка, і працоўныя рукі.

— На тэрыторыі Мілашэвіцкай сярэдняй школы ўраган сарваў больш як сто лістоў шыферу. Дапамог аддзел адукацыі райвыканкама. Прывезлі матэрыялы, адрамантавалі ўсё аператыўна, бо ў школе амаль ужо быў цалкам праведзены бягучы рамонт перад новым навучальным годам, і таму імкнуліся вельмі хутка ўстараніць нанесены будынку ўрон. Дзякуем і брыгадам энергетыкаў, якія прыязджалі да нас, бо было вельмі шмат прарываў сетак. Прыязджалі да нас і супрацоўнікі Белдзяржстраха: наведвалі ўсіх жыхароў, правяралі страхавыя выплаты, і ўжо цяпер іх людзі атрымліваюць праз паштовыя аддзяленні сувязі, — звярнула ўвагу Галіна Гаўрылавец.

Работа працягваецца

Так, пасля стыхіі паступова аднаўляецца адзін з найбольш пацярпелых раёнаў — Лельчыцкі. У ліквідацыі наступстваў непагадзі тут актыўна ўдзельнічаюць усе дэпутаты сельскіх Саветаў дэпутатаў, райсавета.

— Урагану, падобнага таму, што абрынуўся на рэгіён 14 ліпеня, як кажуць нашы старажылы на вёсцы, сапраўды, і не згадаюць. У ліквідацыю наступстваў урагану ўключыліся актыўна ўсе, — падзякавала жыхарам свайго раёна **старшыня Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў Таццяна БЯСПАЛАЯ.**

Ужо не аднойчы ў гэтыя дні лідар дэпутацкага корпуса раёна сама пераапранаецца ў рабочае і бярэцца дапамагаць у ліквідацыі наступстваў непагадзі. Напярэдадні Таццяна Адамаўна разам з супрацоўнікамі Лельчыцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, работнікамі камунальнай службы і вайскоўцамі выехалі наводзіць парадак на вясковых могілках у населеных пунктах Асенскія і Картынічы.

— Прыбіраюцца паваленыя дрэвы, аднаўляюцца зламаныя агароджы. Калі кожны асабістым удзелам робіць свой унёсак, тады і парадак наводзіцца хутчэй, — падкрэсліла Таццяна Бяспалая. — Сёння дапамога ў ліквідацыі наступстваў непагадзі працягваецца. Дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў аб'язджаюць пацярпелыя ад урагану населеныя пункты раёна, цікавяцца, чаго не хапае мясцовым жыхарам, якая патрэбна дапамога. Першачарговая ўвага — пажылым людзям, інвалідам, шматдзетным сем'ям

і адзінокім грамадзянам. Акрамя таго раённая вертыкаль, мясцовая ўлада на вёсцы, дэпутаты, сацыяльныя работнікі, прадстаўнікі працоўных калектываў працягваюць інфармаваць людзей, як ідзе ліквідацыя наступстваў стыхіі, што робіцца для гэтага ў раёне, — дадала старшыня райсавета дэпутатаў.

— Сустракаемся з людзьмі, імкнёмся быць з імі заўжды ў цяжкую хвіліну. Разам наводзім парадак на тэрыторыі сельсавета, на могілках і ў лесе. Шмат зроблена, і спагадлівыя аднавяскоўцы ў гэтым вельмі дапамаглі, за што ім асобная падзяка, — падзялілася **дэпутат Стадоліцкага сельскага Савета дэпутатаў Ніна ПРЫБАЛАВЕЦ.**

Дэпутат Бараўскога сельскага Савета дэпутатаў Рыгор БАРЫСАВЕЦ распавёў, як на іх тэрыторыі працягваюць працу па ліквідацыі наступстваў стыхіі. Ён разам з работнікамі Бараўской сярэдняй школы шчыра ўзяліся за працу на сацыяльна значным для вяскоўцаў аб'екце.

— На тэрыторыі школы былі павалены 32 дрэвы, пашкоджана 10 квадратных метраў даху, знішчана 30 метраў агароджы. Ніхто з работнікаў школы не застаецца ўбаку. Усе разам узяліся за ўборку. У чарговы раз выказваю падзяку ўсім, хто прымаў і прымае ўдзел у найцяжэйшай працы па ліквідацыі наступстваў стыхіі, — гаворыць Рыгор Барысавец.

«Дзякуй, дзеткі»

Як звяртаюць увагу ў раёне, ліквідацыя наступстваў стыхіі на грамадскіх могілках і памятных месцах — цяпер адна з важных задач па ліквідацыі нанесенага ўрону. Адразу пасля здарэння жыхары населеных пунктаў былі заклапочаны, як давядзецца расчышчаць ад буралому месцы пахавання. Хтосьці змог прывесці ў парадак магілкі родных сваімі сіламі, але ў пераважнай большасці выпадкаў — неабходна была дапамога спецыялістаў. Да таго ж многія састарэлыя людзі не ў сілах справіцца з разборам буралому на пахаваннях, а да некаторых магіл увогуле ўжо няма і каму прыязджаць.

У населеных пунктах Лельчыцкага раёна да навядзення парадку на грамадскіх могілках падключыліся добраахвотнікі, працаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, вайскоўцы і ўсе неабыякавыя людзі. Адны з тых, хто падтрымаў акцыю — супрацоўнікі Тонежскай базавай школы і актывісты БРСМ, якія ўзяліся за навядзенне парадку на могілках у аграгарадку Тонеж. «Дзякуй, дзеткі», — толькі словы ўдзячнасці састарэлыя вяскоўцы перадаюць добраахвотным рупліўцам.

Прафсаюзны актыў Лельчыцкай раённай арганізацыі работнікаў адукацыі і навукі зладжана папрацаваў на ўборцы могілак у Лельчыцах. У аграгарадку Баравое Лельчыцкага раёна арганізавалі аднаўленчыя работы на могілках. Выйшлі працоўныя брыгады, у складзе якіх вайскоўцы.

І ў іншых раёнах Гомельшчыны непагадзь навяла свой бязлітасны «парадак» на месцах грамадзянскіх пахаванняў. Ад урагану ў рэгіёне ў цэлым пацярпела 912 могілак. Высокія аварыйныя дрэвы прыбіраюць спецтэхнікай, задзейнічаны прамысловыя альпіністы. На раніцу панядзелка 29 ліпеня каля 500 могілак былі ўжо ўпарадкаваны. Дапамагаюць ў гэтай справе не толькі камунальныя службы раёнаў, але і супрацоўнікі лясгасаў, МНС, калектывы прадпрыемстваў, актывісты грамадскіх аб'яднанняў, дэпутаты, вайскоўцы і праваахоўнікі, моладзь.

Вайскоўцы 336 рэактыўнай артылерыйскай брыгады падключыліся да навядзення парадку ў Мазырскім раёне. Іх працоўны дэсант расчысціў ад паваленых дрэў месца пахавання ў аграгарадку Прудок. У Добрушы прыйшлі на дапамогу актывісты раённай арганізацыі ГА «Белая Русь». Выкарчаваныя дрэвы, заваленыя бураломам праходы паміж пахаваннямі, пашкоджаныя агароджы магіл: з такой «карцінай» на грамадскіх могілках «Лядцы» не захацелі мірыцца жыхары Добрушчыны. Значную работу па расчыстцы тэрыторыі правялі работнікі камунальнай службы, але каб справіцца з усім аб'ёмам аднаўленчых работ, дадатковыя працоўныя рукі былі вельмі дарэчы.

— Як неабыякавыя да роднага горада і яго жыхароў людзі, мы вырашылі дапамагчы, — падзяліліся актывісты, якія згуртаваліся на працу ў каманду з 12 чалавек.

Пашкоджаныя агароджы могілак, помнікі, крыжы, зламаныя дрэвы і галіны... У Гомелі неабыякавыя гараджане ўзялі на сябе значны аб'ём работ на могілках у Асаўцах. Яшчэ раней службы Гомельскага спецыялізаванага камбіната і супрацоўнікі МНС распілавалі пашкоджаныя і зламаныя дрэвы. Падчас акцыі добраахвотнікі расчысцілі тэрыторыю могілак і прылеглую частку.

Ва ўсіх пацярпелых раёнах Гомельскай вобласці — у ліку актыўных добраахвотных памочнікаў ліквідацыі наступстваў стыхіі — супрацоўнікі праваахоўных органаў рэгіёна. Яны забяспечваюць правапарадак на пацярпелых тэрыторыях і расчышчаюць ад буралому тэрыторыі населеных пунктаў. Праваахоўнікі дапамагаюць з аднаўленчымі работамі як арганізацыям, так і мясцовым жыхарам: ладзяць агароджы, убіраюць паваленыя дрэвы на прысядзібных участках, месцах агульнага карыстання, могілках.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота Лельчыцкай раённай газеты «Светлае жыццё».

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 12.119. Нумар падпісаны ў 19.30 30 ліпеня 2024 года.

«І НЕБА ЦЁМНЫМ СКРУТКАМ УЗВІЛОСЯ НАД ЗЯМЛЁЙ»

Залевы, навальніцы, віхуры ў літаратурных творах

Лета прынесла нам не толькі спёку, але і навальніцы ды залевы, якія выпрабоўваюць на трываласць і муры, і дрэвы, і людзей. Так было ва ўсе часы, таму і на старонках літаратурных твораў б'юць маланкі, грымяць грымоты, круцяцца віхуры... А на гэтым фоне адбываюцца цікавыя сюжэтныя падзеі.

Давайце разам перачытаем, як літаратурныя беларусы сустракалі выпрабаванні прыроды, а заадно ўспомнім, як правільна сябе паводзіць у час такіх выпрабаванняў.

«Мы схаваліся ад буры пад высокі стог саломы»

Верш Канстанцыі Буйло пад назвай «Бура» даволі пастаральны — паэтка малюе прыгожы вясковы пейзаж, непагадзь на фоне якога перажываецца героямі як прыемная прыгода. Нават прыкметы буры дужа эстэтычныя: «хмара з рыжым пералівам», «возера цямнейшым стала і не шкліцца ў сонцы болей», вецер «падхапіўшы жмут саломы, як у танцы, кружыць кругам».

«Зазмяіліся маланкі, раскаціўся грукат грому,

Дождж пусціўся ўпрысядкі, льецца буйны і сцюдзёны».

Але нічога не страшна, калі ты не адзін і ёсць дзе схавацца:

«Мы схаваліся ад буры пад высокі стог саломы;

Што адзін у пшанічным полі сведчыць аб багацці плёну,

Падняла ўжо вясёлка сяміцветнае ўзвышша,

Пах зямлі, травы, саломы вее чаем настаяным...»

Дарэчы, героі верша вельмі правільна зрабілі, што сталі ў навальніцу не пад дрэва, а пад стог — спадзяюся, і вы, шаноўныя чытачы, памятаеце, што ў дрэва можа ўдарыць маланка, таму варта шукаць якое кустоўе ці зарасці.

«Ето Ілля катаецца... Ілля-прарок...»

«Першыя навальніцы былі літасцівыя. Але наступная спраўдзіла гразьбу: зіхала, ляскала — ды і кінула грымучы агонь свой на гумны. У гэтым зіханні і ляскanні не адразу ўхапілі, што на гумнах гарыць».

У рамане Івана Мележа «Подых навальніцы» бура — мастацкая дэталь, якая стварае ў чытача трывожнае прадчуванне: лёс галоўнай гераіні, палескай прыгажуні Ганны, будзе горкі, згарыць яе наладжанае жыццё, як тыя гумны. Ганна выйшла замуж не па каханні, за мясцовага багацея Яўхіма Глушака. Іх маленькая дачушка захварэла, але Глушакі не жадаюць адцягваць час і сілы на дзіця, лячыць, везці да доктара — жаць трэба. І хворае немаўля даводзіцца браць з сабою ў поле.

«Укрывала, затульвала сабой ад ветру. Вецер быў неспакойны, халодны, як крынічнай вадою абліваў шыю — прыйшлося ўсцягнуць на сябе посцілку. Амаль увесь час нядобра, трывожна шумеў дуб...»

Лютуе навальніца і ў тую ноч, калі маленькая Верачка памірае:

«— Не бойся... Ето Ілля катаецца... Ілля-прарок... — туліла малую, ласкава і трывожна шаптала ёй Ганна. — Ён добры... Ён малых не чапае... Ён толькі здаецца такі — страшны... А напраўду ён — добры... Добры...

І ў громе чула, як цяжка, часта дыхае Верачка, — хоць словам, хоць чым-небудзь хацела памагчы малой!»

Хоць Ганна і кажа, што маланка бяспечная — але ж і ў Куранях вунь колькі пажару праз іх нарабілася! Лепш, як пачне за воknамі бліскаць, зачыніць вокны ды дзверы і выцягнуць усе штэпселі з разетак.

«Трубілі сурмы праз смугу туманаў»

Візуальным увасабленнем рамантызму лічаць карціну нямецкага мастака Каспара Давіда Фрыдрыха «Вандроўнік над морам туману»: самотная цёмная постаць на фоне раз'юшаных хваляў і скалаў. Хоць Уладзімір Караткевіч абураўся, калі яго называлі рамантыкам, тым не менеў ёсць у яго пейзажы проста як на карціне Каспара Фрыдрыха, прыкладам, у апавяданні «Вока тайфуна» і аповесці «Чазенія». Самая каларытная бура, апісаная Караткевічам — гэта, бадай, пралог да рамана «Леаніды не вернуцца да зямлі», які мае асобную назву «Вераб'іная ноч» і нават друкуецца час ад часу як асобны твор: афіцэр Гораў у страшную буру перапраўляе цераз раку жонку паўстанца, якой трэба перадаць памілаванне мужу. Непагадзь часта з'яўляецца і ў іншых яго творах. Згадаем менш вядомы верш «Патоп (Старажытны беларускі апокрыф)», дзе эпічна малюецца карціна канца свету:

«І дзень прыйшоў. І пацьмянела сонца.
Распаўся час. І неба цёмным скруткам
Узвілося над зямлёй. І лінуў дождж,
Як быццам сто гадоў збірала неба
Ваду дажджоў, азёр і рэчак ціхіх,
Ваду, што выссалі вясёлкі з лужын,
Ваду пралітых чалавечых слёз...
...І дождж лупіў. І зранку цэлы дзень
Трубілі сурмы праз смугу туманаў,
І здраднікі хаваліся ў каўчэгах,
Якія заліваў сіберны дождж.
Вада пакрыла роўныя мясціны
І коміны халуп і ўсе палацы.
Раўлі шалёныя сівыя хвалі,
Раздзёршы ветразі тугія ў лоск.
І людзі ўгору ўзнімалі рукі
Ў чаўнах, што ймчалі па гарбатых хвалях,
Ранімыя вятрамі і агнём».

Верш напісаны ў 1956 годзе, калі Караткевічу было дваццаць шэсць, і галоўная слава чакала наперадзе. Сцэна, апісаная ў вершы «Патоп», потым увойдзе ў раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» — там кат Цыкмун Жаба будзе разыгрываць у ночвах з драўлянымі фігуркамі сцэну сусветнага патопу. Але ва ўсіх гэтых эпічных сцэнах Караткевіча сэнс адзін: чалавек перамагае стыхію, таму што мацней за любую буру яго каханне да жанчыны, любоў да Радзімы, пачуццё гонару. Герой верша «Патоп» не хоча на выратавальны каўчэг — ён хоча падзяліць лёс са сваёй каханай і са сваёй зямлёй.

А калі ўжо вас заспела залева, пастарайцеся ўсё ж такі не хавацца пад канструкцыямі, якія могуць лёгка абрушыцца, кшталту рэкламных шчытоў, ну і не быць там, дзе вас можа затапіць.

«На Брэстчыне карыбскі ўраган»

Верш Пімена Панчанкі, напісаны ў 1974 годзе, відавочна спісаны з натуры. Лета, самы сенакос — а тут здарылася на Брэстчыне залева. Ды такая, як у экзатычных краінах. Але беларусы не здаюцца — і працягваюць працаваць, таму што чалавек мацней за стыхію:

«На Брэстчыне карыбскі ўраган,
Паводка бангладэшская ўвосень.
Дажджы зімой.
Снягоў няма.
Туман.
На бронетранспарцёрах сена звозім.
Калі б тут не сапраўдная бяда,
Дык можна б пастаяць і падзівіцца.
Але вада, страшэнная вада,
Нялёгка часам да людзей прабіцца.
Жывой вады руйнуючы ўдар,
Мы зубы сцялі, не клянём нікога.
Плывуць стагі па небе паміж хмар
І не знаходзяць сонца залатога».

У здавалася б зразумелых радках паэт у духу свайго часу дае адсылкі і да палітычнага становішча: у 1974 годзе дамаглася незалежнасці Карыбская Грэнада, у Бангладэш, якая толькі-толькі таксама атрымала незалежнасць, здарылася страшная паводка, ад праліўных дажджоў загінулі дзясяткі тысяч людзей.

«Дае прырода зноў урокі нам:
Не верце цішыні, салодкім снам,
Бяда і радасць ходзяць побач вечна,
Людзей ратуе толькі чалавечнасць».

«Жыве па-свойму глыбіня»

Паэт-франтавік Кастусь Кірэенка дае свой рэцэпт ратунку ад буры — праўда, яна ў яго вершы ўвасабляе нападкі нядобразычліўцаў, паклёпы і зайздрасць. Што рабіць? Заставацца верным сабе, не зважаць на віраванне зла:

«Раве над морам, б'е віхура,
За валам вал, нібы гайня.
Ды толькі б як ні выла бура —
Жыве па-свойму глыбіня.
Там мір святла, там спеюць сілы,
Там свой заўжды, глыбінны, свет...
Вось так і ты для справы мілай
Настрой душу сваю, паэт.
Хоць як шалеюць злыдні свету,
Хоць як вярзуць на нас і час —
Ісці на свой маяк да мэты —
Такі ў паэта свой наказ».

У гэтай парадзе ёсць і практычны сэнс — бегаць у навальніцу нельга. Калі заспела яна цябе ў чыстым полі, шукай кустоўе ці канаву, прыгніся... А вось з вады ў любым выпадку лепш неадкладна вылезці — маланка, якая трапіла ў ваду, уражвае ў дыяметры ста метраў.

«А вы, перапрашаю, не ведаеце, што такое арабінавыя ночы?»

А якая бура надараецца ў паноў Кубліцкага ды Заблоцкага з казачнай аповесці Пятра Васючэнкі! Ненаватыя паны маюць з прыпасаў адну толькі рэпу, што расце на іх агародзе. Паехалі яны на кірмаш. І прапанавалі ім там набыць насенне дрэў хлебных, кілбасных, марцыпанавых... Паны закупіліся. Але заўважылі яшчэ нейкую чорную семку, якую рыжа-лысы гандляр ім не прадаў. Але ж паны ганаровыя — набылі! А што з яе вырасце? Рыжа-лысы сумленна папярэдзіў: ветрык... Лепш не сейце. Але каб паны кагось слухаліся! Усё пасеялі і чакаюць. І тут надарылася арабінавая ноч...

«А вы, перапрашаю, не ведаеце, што такое арабінавыя ночы? Гэта напрыканцы лета бывае, у спасаўку. Усю ноч неба скалануюць грымоты, сякуць фіялетавыя маланкі, шугае вецер, утвараючы віхуры, — і хаця б кропля дажджу. Кажуць, што ўся зямная нечысць — чарты, ваўкалакі, вядзьмаркі, шаманы, цмокі ладзяць арабінавай ноччу свой шабаш. О, паны зведалі-такі, што такое арабінавая ноч! Спачатку ім здалося, што яны разам са сваёй хацінаю апусціліся на дно аграмаднай чарніліцы з самым чорным у свеце атрамантам. Потым, калі ўсё вакол загрукацела, зазіхцелася, зашыпела, пан Кубліцкі пачаў зубамі выстукваць маршоўку касінераў яго вялікасці караля Гарбуза, а пан Заблоцкі — улюбёны паланэз яго светласці князя Дрыгайлы. Але назаўтра...

Назаўтра паны нясмела вызіраюць з акна на агарод, а ў панскім агародзе тырчаць: кілбаснае дрэва, хлебнае дрэва, булачнае дрэва, пірожнае дрэва, цукерачнае дрэва, віннае дрэва, марцыпанавае дрэва, селядцовае дрэва...»

І было б панам шчасце, але прарасла і чорная семка «ветрыка»: вырас нейкі таўсты чорны гарбуз, а з яго «выпаўзае нейкая чорная хмарка. Яна круціцца на месцы, усё хутчэй ды хутчэй, і ператвараецца ў чорную віхуру...»

Зжэр той «ветрык» усе панскія дрэвы — і хлебнае, і кілбаснае, і марцыпанавае, і зляцеў на смешных куцапых чорных крылах на процілеглы край Сусвету.

Трохі падобны той «ветрык» да шаравой маланкі — яна таксама непрадказальная і можа зжэрці ўсё на сваім шляху... Заляцела ў пакой — лепш не рабіць рэзкіх рухаў, не спрабаваць выгнаць, як муху. Лепш асцярожна схавацца за дзверы, па магчымасці адчыніць фортку.

«З маланкаю ў сэрцы»

Паэт-філосаф Алесь Разанаў умеў у праявах прыроды ўбачыць высокую сімволіку. «Маланка жне, гром малоціць» — так называецца адна з яго кніг. А верш «Маланка» можна чытаць як прыпавесць:

«Тады, калі я ўвайшоў у бажніцу і, зачыніўшы дзверы, стаў гутарыць з небам, з неба раптоўна ўпала маланка і раскалола бажніцу надвое.

Людзі, якія прыйшлі на світанні, адбудавалі з адной яе палавіны бажніцу світання,

а людзі, якія прыйшлі на змярканні, адбудавалі з другой палавіны бажніцу змяркання.

— Хадзі да нас, — заклікаюць мяне адны, — гэта ж твая бажніца: ты зноў тут зможаш казаць свае словы да неба...

— Хадзі да нас, — пераймаюць мяне другія, — гэта твая бажніца: ты зноўку тут зможаш слухаць, што кажа неба...

А я ўсё стаю на тым самым месцы,
здранцвелы,
уражаны,
праяснёны,
не маючы мовы, каб гаварыць, —
з маланкаю ў сэрцы».

Ну, калі ўжо ў кагосьці патрапіла маланка — раяць абліць галаву небаракі халоднай вадой, пры неабходнасці — зрабіць штучнае дыханне, выклікаць «хуткую». Гэта толькі паэт можа з маланкаю ў сэрцы жыць і нават складаць вершы.

Няхай, шаноўныя чытачы, абмінуць вас усе буры, а калі і надарыцца сустрэцца з разлютаванай прыродай, няхай гэта стане толькі бяскрыўднай рамантычнай прыгодай.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Организатор публичных торгов (аукциона)	ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by
Продавец	ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102

Первые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 19.06.2024 в газете «Звязда» № 118 (30252), стр. 15

Предмет публичных торгов (аукциона)

№	Наименование (назначение), адрес	Начальная цена, с НДС/ без НДС, бел./ росс. руб.	Минимальная цена, с НДС, бел. руб. НДС/ без НДС, бел./ росс. руб.
1	Мотодепо (капитальное строение с инвентарным номером 710/С-84481), корпус № 62, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/50, общей площадью 464,1 кв. м, основные средства, материалы	81 000,00 бел. руб. с НДС	54 000,00 бел. руб. с НДС
2	Дебиторская задолженность. Наименование дебитора: Акционерное общество «Торговый дом «Оргсинтез» (125319, Россия, г. Москва, Муниципальный округ аэропорт вн. тер. г., ул. Академика Ильюшина, д. 12, эт./пом./комн./оф. 1/VII/А3Д, огрн: 1127747058284, дата присвоения ОГРН: 18.10.2012, ИНН: 7714887246, КПП: 771401001)	9 153,41 росс. руб. без НДС	8 238,07 росс. руб. без НДС
3	Автомобильный прицеп-цистерна б/у вместимостью 3 куб. м	1 015,20 бел. руб. с НДС	676,80 бел. руб. с НДС
4	Прицеп бортовой МАЗ-8926 1988 г. в., кузов (рама) № 872575, регистрационный знак 5161 АА-6	3 024,00 бел. руб. с НДС	2 016,00 бел. руб. с НДС
5	Полуприцеп специальный, цистерна, NEFAZ9638 2013 г. в., кузов (рама) м № X1F963800D0000627, регистрационный знак А 4761 А-6	42 228,00 бел. руб. с НДС	28 152,00 бел. руб. с НДС

Восьмые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 11.07.2024 в газете «Звязда» № 133 (30267), стр. 11

6	Участок ремонта тары, корпус № 79А, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/3	33 384,00 бел. руб. с НДС	16 692,00 бел. руб. с НДС
7	Насосная при 3-секционной градирне, корпус № 69Б, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/6	38 544,00 бел. руб. с НДС	19 272,00 бел. руб. с НДС
8	2-секционная градирня подземного железобетона, корпус № 69В, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/4	73 200,00 бел. руб. с НДС	36 600,00 бел. руб. с НДС
9	3-секционная градирня, корпус № 69А, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/5	57 120,00 бел. руб. с НДС	28 560,00 бел. руб. с НДС

Задаток 10 % от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

Шаг электронных торгов – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола о результатах торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **2 %–4 % от цены продажи лота, в зависимости от цены продажи лота**

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

Дата и время проведения торгов (аукциона): 14.08.2024, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются с 31.07.2024 по 13.08.2024 г. до 16.00

Контактные данные	**Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**

ООО «Реалконсалтинг»

извещает о проведении открытого аукциона № 14/24 по продаже капитальных строений в г. Минск

Предмет аукциона

Лот № 1 – два капитальных строения, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 500000000001000040 площадью 0,2117 га:

- **капитальное строение с инвентарным номером 500/С-2735, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Первомайская, д. 24, корп. 2, площадь – 2057,5 кв. м, наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное;**
- **капитальное строение с инвентарным номером 500/С-25053, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Первомайская, 24, площадь – 74,7 кв. м, наименование – здание склада (лит. Д 1/К), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ.**

Обременение: аренда.

Начальная цена лота – 1 500 000 долларов США с учетом НДС 20 %, шаг аукциона – 5 % от начальной цены

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 14/24 (далее – Положение), утвержденным Организатором аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. внести задаток в размере 30 000 рублей на расчетный счет продавца BY03ALFA30122C58200010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», БИК ALFABY2X, получатель платежа – ООО «СКТБ РИТМ ПРЕМИУМ», УНП 191652673, назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе № 14/24»;
2. подать заявление на участие в аукционе с приложением документов, предусмотренных Положением.

Последний день приема заявлений и внесения задатка: 04.09.2024 до 17.00.

Аукцион состоится 06.09.2024 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, п. 701

Победителем аукциона объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона (единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов) обязан: возместить Организатору затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; подписать договор купли-продажи предмета аукциона в течение 20 дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора купли-продажи не договорятся об ином сроке.

Оплата предмета аукциона производится в белорусских рублях по курсу доллара США к белорусскому рублю, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату платежа.

Победителю аукциона (единственному участнику, согласившемуся приобрести предмет аукциона по цене, увеличенной на 5 процентов) внесенный задаток учитывается в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи предмета аукциона, другим участникам задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона, о чем Организатором извещаются участники аукциона

Организатор аукциона: ООО «Реалконсалтинг», г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. тел.: +375 (17) 256 61 35, +375 (25) 549 86 22 auction@expertiza.by, https://www.expertiza.by Продавец – ООО «СКТБ РИТМ ПРЕМИУМ», г. Минск, ул. Первомайская, 24/2

Ликвидатор СП «Промекс» ООО Лапатин Юрий Геннадьевич извещает о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего СП «Промекс» ООО

Торги будут проведены **30 августа 2024 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22Б, оф. 316.

Для участия в торгах необходимо подать **до 27 августа 2024 года** заявку и перечислить на расчетный счет организатора торгов BY87-BLBB30120100349659001006 в ОАО «Белинвестбанк», код BLBBBY2X, УНП100349659, сумму задатка в размере 3 % от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5 % от начальной цены предмета аукциона.

Прием заявок и документов на участие в торгах осуществляет организатор торгов ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 18.00 по адресу электронной почты: yury.kisser@yandex.by.

Сведения об имуществе, выставляемом на торги:

Сведения об имуществе	Начальная цена	Сумма задатка
27/100 долей в сооружении специализированном водохозяйственного назначения, расположенном по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 85, район п. Городище, наименование – насосная станция пожаротушения (инв. № 600/С-180681)	15 320,00	459,6

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену. Все расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи, оформлением перехода права собственности, несет покупатель.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней с даты проведения торгов.

Организатор вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 2 дня до даты проведения торгов.

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. Тел. +375 17 310-36-37
Продавец	Вязынский сельский исполнительный комитет, 222445, Минская обл., Вилейский р-н, аг. Вязынь, ул. Заводская, 17. Тел. 8 (01771) 66252
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, пом. 5. Тел. +375 17 373-21-33. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов: легковой универсал VAZ-21713 135-21, рег./зн. 5НА Т 2013, № кузова ХТА217130С0094458, 2012 г. в., инв. № 01540002, по адресу: Минская обл., аг. Вязынь, ул. Заводская, 17. **Начальная цена лота (без НДС) – 6 700,00 бел. руб.** Шаг торгов – 335,00 бел. руб.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 02.09.2024. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **30.08.2024** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (http://gki.gov.by) от 31.07.2024 г.

Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. **E-mail:** auction@cpo.by

УНП 600015824

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

УНП 690363881

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Озерицкий-Агро» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

Лот № 1:

- склад гранулированных кормов *(составные части и принадлежности: пандус, асфальтовое покрытие, подпорные стены, тамбур, люковый проем, кирпичное помещение, шахта, емкость)***, инв. № 614/С-40357;**

- здание для хранения сена МТФ «Слобода», инв. № 614/С-39908, общей площадью 644 кв. м;

- здание пожарного поста на 1 машину в районе МТФ «Слобода» *(составные части и принадлежности: навес)***, инв. № 614/С-40534, общей площадью 296,5 кв. м;**

- здание блока служебных помещений МТФ «Слобода» *(составные части и принадлежности: подвал, сход в подвал)***, инв. № 614/С-40535, общей площадью 397,4 кв. м;**

- здание коровника *(составные части и принадлежности: 4 (четыре) навеса)***, инв. № 614/С-40350, общей площадью 1906,5 кв. м;**

- здание коровника, инв. № 614/С-40356, общей площадью 1424,2 кв. м;

- молочный блок, инв. № 614/С-40351, общей площадью 96,7 кв. м.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером **624800000001002451 площадью 5,0096 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, в близи аг. Слобода, 4/2; 4/1; 4/7; 4; 4/3; 4/5; 4/7 соответственно.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,1233 га;

- ветпункт стационар и изолятор, инв. № 614/С-44472, общей площадью 300,0 кв. м;

- здание коровника *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)***, инв. № 614/С-44474, общей площадью 5204,2 кв. м.**

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером **624883000018000076 площадью 3,4134 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, в близи аг. Слобода, 4А/1; 4А соответственно.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей до 1000 вольт, пл. 0,0557 га;

- здание коровника *(составные части и принадлежности: пристройка)***, инв. № 614/С-40355, общей площадью 2109,2 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624800000001004527 площадью 0,7392 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, расположенный в близи аг. Слобода, 4/4.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей до 1000 вольт, пл. 0,0356 га; придорожная полоса автомобильных дорог, пл. 0,0024 га.

Начальная цена с НДС (20 %) – **1 804 609,73** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **180 460,00** бел. руб.

Лот № 2:

- здание телятника с инв. № 614/С-48943 общей площадью 1314,1 кв. м;

- здание коровника с инв. № 614/С-48942 *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)* **общей площадью 1608,8 кв. м (далее – Объекты).**

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером **624800000001004920 площадью 3,0322 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, в районе д. Аношки.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0450 га; охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,4320 га.

Начальная цена с НДС (20 %) – **330 224,98 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены – **33 022,00 бел. руб.**).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов и оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующем размере: по лоту № 1 – 2 (два) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона, по доту № 2 – 4 (четыре) процента.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» по лоту № 1 от 22.10.2022, 08.06.2024, по лоту № 2 от 16.12.2021, 08.06.2024.

Аукцион состоится **13.08.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.08.2024** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра: 8 (01776) 28-516, 8 (029) 347-22-75.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Карысна ведаць

АДВЕСЦІ ЎДАР АД ПЕЧАНІ

Вірусныя гепатыты штогод забіраюць жыцці больш чым мільёна чалавек па ўсім свеце. І, на жаль, захваральнасць застаецца высокай. Для інфіцыравання небяспечным і вельмі заразным вірусам гепатыту В (у 100 разоў больш прыліпчывым, чым ВІЧ) дастаткова ўсяго кроплі крыві ці іншай біялагічнай вадкасці, якая кантактуе з крывёй. З-за сваёй устойлівасці гэты вірус можа доўгі час захоўвацца ў навакольным асяроддзі. У замарожаным выглядзе ён захоўваецца ажно 20 гадоў! Пры пакаёвай тэмпературы жыве на працягу трох месяцаў, пры апрацоўцы фармалінам — тыдзень, хларыраванне можа вытрымліваць цэлыя дзве гадзіны, а кіпячэнне — гадзіну. І толькі 80-працэнтны этылавы спірт абясшкоджвае вірус на працягу дзвюх хвілін.

НЕПРЫКМЕТНЫ ЗАБОЙЦА

Гепатыт — небяспечны вірус, які выклікае запаленчыя працэсы ў печані і можа прыводзіць да яе цырозу і раку. Існуе пяць відаў віруса гепатыту, але найбольш распаўсюджаныя два — В і С. Небяспека віруснага гепатыту ў тым, што ён доўгі час можа праходзіць непрыкметна, а сімптомы з'яўляюцца толькі на позніх стадыях.

— На жаль, нягледзячы на паляпшэнне інструментаў дыягностыкі і лячэння, а таксама зніжэнне цэн на вакцыны, узровень ахопу вакцынацыяй і лячэннем замарудзіўся і смяротнасць ад віруснага гепатыту расце ва ўсім свеце, — адзначае **прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Сяргей ДЗІОРДЗІЦА.** — У 2022 годзе ва ўсім свеце ад прычын, звязаных з вірусным гепатытам, памерла каля 1 мільёна 300 тысяч чалавек у параўнанні з 1 мільёнам 100 тысячамі ў 2019 годзе. З іх 83 % выпадкаў выклікана гепатытам В, а 17 % — гепатытам С. Такім чынам штодзённа ў свеце ад інфекцыі гепатыту В і С памірае 3,5 тысячы чалавек.



У Еўропе захворванне на вірусны гепатыт нераўнамернае: ёсць краіны з нізкай эндэмічнасцю, а ёсць — з высокім узроўнем захваральнасці. У рэгіёне больш за 10,5 мільёна чалавек інфіцыравана гепатытам В. Але пра свой статус ведае толькі 16 % з іх, а атрымлівае лячэнне — усяго 12 %. Больш за 8,5 мільёна інфіцыравана гепатытам С, з іх ведае пра свой статус 29 %, атрымлівае лячэнне — 9 %.

Аднак ёсць і станоўчыя моманты: 50 з 53 еўрапейскіх краін паспяхова рэалізавалі праграму ўсеагульнай вакцынацыі дзяцей ад гепатыту В, у тым ліку дзевяць краін дасягнулі рэгіянальных мэт па барацьбе з гепатытам В да 2023 года, сярод іх і Беларусь.

— У нашай краіне знойдзена значная работа па імунізацыі насельніцтва ад усіх асноўных хвароб, якія можна папярэдзіць з дапамогай вакцынацыі. І гепатыт В паддаецца прафілактыцы з дапамогай бяспечных і эфектыўных вакцын, якія забяспечваюць амаль 100-працэнтную абарону ад захворвання, — падкрэсліў прадстаўнік САЗ.

Ён расказаў, што ўжо 30 гадоў САЗ падтрымлівае намаганні Міністэрства аховы здароўя Беларусі па вакцынацыі супраць гепатыту В. І Еўрапейскі рэгіянальны офіс САЗ даў Нацыянальнаму экспертнаму савету па імунізацыі рэкамендацыі, павучанні, а таксама садзейнічаў наладжванню абмену вопытам з кансультатыўнымі групамі па імунізацыі з іншых краін.

У 2022 годзе САЗ даў Беларусі неабходную падтрымку для правядзення нацыянальнага даследавання па ацэнцы праграмы вакцынацыі супраць гепатыту В. Яно паказала, што імунізацыя прывяла да фактычнай ліквідацыі гепатыту В сярод дзяцей, якія нарадзіліся ў поствакцынальны перыяд. Вынікам гэтай сумеснай работы стала ўручэнне ў 2023 годзе Міністэрству аховы здароўя афіцыйнага сертыфіката САЗ аб дасягненні рэгіянальных мэтавых паказчыкаў барацьбы з гепатытам В шляхам імунізацыі.

ДЗЕ БЯСПЛАТНА ПРАВЕРЫЦЦА?

Як пацвердзіла **ўрач-эпідэміёлаг аддзела прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і парэнтэральных вірусных гепатытаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана СЕРГЯЕНКА**, у Беларусі адзначаецца выражаная тэндэнцыя да зніжэння захваральнасці вірусным гепатытам В і С. За апошнія 10 гадоў захваральнасць на востры гепатыт В знізілася ў пяць разоў — за кошт вакцынацыі. Гэта надзейная абарона ад інфекцыі. У краіне ў адпаведнасці з Нацыянальным календаром прафілактычных прышчэпак усе нованароджаныя дзеці атрымліваюць першую прышчэпку ад гепатыту В у першыя 12 гадзін жыцця, а наступныя — у два, тры і чатыры месяцы. Таксама па эпідэміялагічных паказаннях прышчэпкі робяць медыцынскім работнікам, якія маюць кантакт з крывёй і біялагічнымі вадкасцямі; кантактным асобам у ачагах гепатыту В; асобам, якія заняты ў вытворчасці імуналагічных лекавых прэпаратаў; студэнтам і навучэнцам медыцынскіх ВНУ і каледжаў.

— Вакцыны, якія прымяняюцца ў Беларусі, характарызуюцца высокай дапушчальнасцю і эфектыўнасцю. З 2021 года ў краіне рэалізуецца сістэма мерапрыемстваў па элімінацыі віруснага гепатыту С. Адно з асноўных мерапрыемстваў — лячэнне пацыентаў з гепатытам С. Лячэнне бясплатнае, прэпараты закупляюцца за кошт дзяржаўнага бюджэту, — адзначыла Святлана Сергяенка.

У рамках мерапрыемстваў, прымеркаваных да Сусветнага дня барацьбы з віруснымі гепатытамі (адзначаецца 28 ліпеня), у Мінску да 16 жніўня можна прайсці дабравольнае ананімнае бясплатнае экспрэс-тэсціраванне на гепатыт В і С у кансультатыўным кабінеце Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя па адрасе: Клары Цэткін, 4. Падчас чакання выніку, які будзе гатовы праз 10-15 хвілін, можна прайсці кансультацыю па пытаннях прафілактыкі гепатыту В і С.

Абследавацца на гепатыт В і С можна ў кожнай паліклініцы па месцы жыхарства. Прышчапіцца ад гэтай інфекцыі спецыялісты рэкамендуюць усім дарослым, якія не атрымалі прышчэпку ў дзяцінстве, а тым, хто хварэў на гепатыт С, — у абавязковым парадку.

ГЕПАТЫТ С: ЛЯЧЭННЕ ДЛЯ ЎСІХ

Вакцыны ад гепатыту С не існуе, але гэта інфекцыя паспяхова лечыцца. У Гарадской інфекцыйнай бальніцы г. Мінска працуе адзінае ў краіне аддзяленне вірус-асацыіраваных цырозаў печані. Сюды могуць трапіць пацыенты па накіраванні інфекцыяністаў сталічных паліклінік. Акрамя таго, на базе бальніцы функцыянуе рэспубліканскі гепаталагічны цэнтр, куды могуць звяртацца пацыенты з іншых рэгіёнаў і пры неабходнасці прайсці абследаванне ў стацыянары.

— На сёння лячэнне ад гепатыту С атрымліваюць абсалютна ўсе пацыенты, але, безумоўна, ёсць прыярытэтныя групы — тыя, каму лячэнне прызначаецца неадкладна. У першую чаргу гэта пацыенты з цырозам печані і тыя, хто рыхтуецца да трансплантацыі печані. Асаблівасцю сучаснага этапу з'яўляецца і той факт, што абсалютна ўсе пацыенты, што паступаюць у нашу бальніцу, у абавязковым парадку абследуюцца на маркёры гепатыту В і С. Такім чынам мы стараемся максімальна пашырыць выяўленне тых людзей, якія маюць хранічную інфекцыю, — расказала **загадчык аддзялення вірус-асацыіраваных цырозаў печані гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы Людміла ЖМУРОЎСКАЯ.**

Яна адзначыла, што эфектыўнасць супрацьвірусных прэпаратаў вельмі высокая — 98-99 %.

— Крайне рэдка сустракаюцца пацыенты, чый арганізм не адрэагаваў на першы курс тэрапіі, і на сёння дзяржава закупіла шэраг прэпаратаў, якімі праводзіцца пералечванне і далечванне. Сродкі эфектыўныя, вынікі вельмі добрыя. Мы працуем гэтак жа, як і ўвесь свет. Кошт лячэння на сёння значна знізіўся ў параўнанні з тым, якім ён быў напачатку, — дадала ўрач.

Скажыце, доктар...

ЗБЕРАГЧЫ ЛЁГКІЯ

Што трэба ведаць пра пнеўманію

Мікаплазменная інфекцыя, якая выклікае шэраг рэспіраторных праяў, у тым ліку бранхіты і пнеўманіі, актывізуецца кожныя чатыры-восем гадоў. Менавіта сёлета ў вясенне-летні перыяд адбыўся ўсплёск такіх пнеўманій. Чым небяспечнае гэта захворванне і хто найбольш рызыкуе, расказала ўрач-эпідэміёлаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Аліна ЕМАШОВА.

— Растлумачце, што такое пнеўманія?

— Пнеўманія — вострае захворванне, пры якім у лёгкіх развіваецца запаленне. Яго выклікаюць мікраарганізмы (узбуджальнікі), часцей за ўсё гэта бактэрыі, напрыклад пнеўмакок або мікаплазма. Радзей пнеўманію выклікаюць вірусы (напрыклад, вірус грыпу), часам найпростыя (дрожжападобныя грыбы, candida). Здараецца, бактэрыі і вірусы могуць выяўляцца ў пацыентаў з пнеўманіяй адначасова, тады размова ідзе пра мікст-інфекцыю.

— Часта даводзіцца чуць тэрмін «пазабальнічная пнеўманія»...

— Пнеўманію называюць пазабальнічнай, калі яна развілася за межамі бальніцы ці іншай лячэбнай установы.

— Як мы можам заразіцца?

— Мікраарганізмы часцей за ўсё трапляюць у лёгкія праз дыхальныя шляхі — трахею, бронхі. Пры гэтым пнеўманія ўзнікае толькі ў тым выпадку, калі арганізм чалавека не можа своечасова «выдаліць» магчымага ўзбуджальніка (напрыклад, аслаблены імунітэт, у лёгкія трапіла вялікая колькасць бактэрый), альбо ўзбуджальнік з'яўляецца вельмі агрэсіўным.

— Хто найчасцей у групе рызыкі?

— Пнеўманія можа развівацца ў любым узросце, але часцей сустракаецца ў пажылых людзей (асабліва старэйшых за 65 гадоў), а таксама пры наяўнасці хранічных спадарожных захворванняў, такіх як сардэчная недастатковасць, цукровы дыябет, хранічная абструктыўная хвароба лёгкіх. Спрыяюць развіццю пнеўманіі пераахаладжэнне, злоўжыванне алкаголем, курэнне, прыём лекаў, што прыгнятаюць імунітэт.

— Як праяўляецца захворванне?

— У выніку запалення ў лёгкіх назапашваецца сакрэт, які можа парушаць абмен кіслароду і вуглякіслага газу і прыводзіць да з'яўлення задышкі (цяжкасці дыхання). Пры пнеўманіі запаленне часта распаўсюджваецца на бронхі, што можа прыводзіць да з'яўлення кашлю і макроты. Гэта суправаджаецца з'яўленнем боляў у грудзях пры кашлі, дыханні. Пры запаленні лёгкіх у большасці пацыентаў назіраюцца павышэнне тэмпературы (звычайна вышэй 38 °С) дрыжыкі, слабасць, павышаная стамляльнасць, моцнае потааддзяленне па начах.

Развіццю захворвання могуць папярэднічаць сімптомы прастуды (болі ў горле, насмарк і іншыя). Пнеўманія, у сваю чаргу, можа прывесці да абвастрэння наяўных хранічных захворванняў.

Пнеўманія — сур'ёзнае захворванне, якое пры несвоечасовай дыягностыцы або няправільным лячэнні можа прыводзіць да развіцця ўскладненняў і нават смерці. Таму, калі вы западозрылі ў сябе запаленне лёгкіх, трэба неадкладна звярнуцца да ўрача.

Для таго каб папярэдзіць пнеўманію, важна прытрымлівацца агульных правіл па ўмацаванні здароўя, у прыватнасці кінуць курыць, мець рэгулярныя фізічныя нагрузкі і дастатковае збалансаванае харчаванне.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества общества с ограниченной ответственностью «ЗападХимИнвест»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S	648,00	64,80	32,40
2	Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S	648,00	64,80	32,40
3	Морозильный ларь МЛГ-350 серый	780,00	78,00	39,00
4	Терминал Ingenico ICT220 Ethernet/Dial-up/GSM с выносной клавиатурой для ввода пин-кода IPP220 Contactless с кабелем Enhernet, с/н 15303CT24459088, инв. № 282	468,00	46,80	23,40
5	Морозильный ларь МЛГ-350 серый, инв. № 7965	780,00	78,00	39,00
6	Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. (RAL 8017), инв. № 7966	1 320,00	132,00	66,00
7	Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. (RAL 8025), инв. № 8016	1 320,00	132,00	66,00
8	Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. (RAL 8025), инв. № 8021	1 320,00	132,00	66,00
9	Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 8130	1 812,00	181,20	90,60
10	Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 8149	648,00	64,80	32,40
11	Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 8150	648,00	64,80	32,40
12	Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 8316	648,00	64,80	32,40
13	Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 8317	648,00	64,80	32,40
14	Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 8832	1 812,00	181,20	90,60
15	Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 8833	1 812,00	181,20	90,60
16	Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 8834	1 812,00	181,20	90,60
17	Холодильник с морозильником Beko RCNK335K00W, инв. № 8872	756,00	75,60	37,80
18	Холодильник с морозильником Beko RCNK335K00W, инв. № 8873	756,00	75,60	37,80
19	Холодильник с морозильником Beko RCNK335K00W, инв. № 8876	756,00	75,60	37,80
20	Холодильник с морозильником Beko RCNK335K00W, инв. № 8877	756,00	75,60	37,80
21	Холодильник с морозильником Beko RCNK335K00W, инв. № 8878	756,00	75,60	37,80
22	Шкаф холодильный DM 104-Bravo корич. (RAL 8017), инв. № 8913	1 320,00	132,00	66,00
23	Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 9098	1 812,00	181,20	90,60
24	Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 9099	1 812,00	181,20	90,60
25	Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 9100	1 812,00	181,20	90,60
26	Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 9185	1 800,00	180,00	90,00
27	Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 9233	1 800,00	180,00	90,00
28	Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 9234	1 800,00	180,00	90,00
29	Насос дренажный Mini Blank, инв. № 3989	348,00	34,80	17,40

В отношении лотов проводятся первые торги

Местонахождение лотов: Минская обл., Воложинский р-н, аг. Раков, ул. Радошковичская, 77

Дата и время проведения торгов	**2 сентября 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
